Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 КАСТРЫЧНІКА 2015 г. АЎТОРАК № 207 (28065) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




Хто куды, а мы ў ламбард?

СТАР. 5



Як ратаваць «лёгкія планеты»

СТАР. 7



На што траціць пенсію Герой працы

СТАР. 12

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЗАБАРОЎСКІ, першы намеснік міністра эканомікі:**

*«Рэалізацыя захадаў урада і Нацбанка на 2016 год дазволіць знізіць стаўкі па нільготных крэдытах з цяперашніх 37% да 24-27%, сярэдняя стаўка па эканоміцы складзе 15% пры інфляцыі ў 12%. Гэта значыць, будуць тыя класічныя 3% маржы, пра якія мы гаворым з пункту гледжання адпаведнасці інфляцыі і сярэдняй стаўкі па крэдытах».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.10.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17313,00 | ▲ |
| Еўра | 19109,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 276,87 | ▼ |
| Укр. грыўня | 756,03 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# АЗБУКА ЖОЎТАГА ЛІСЦЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На прагулцы ў асеннім парку маладая мінская матуля Юлія РАСЫХІНА са сваімі маленькімі дочкамі-двайнятамі Верай і Варварай.

■ Новыя сацпаслугі

## НА ПАЖЫЦЦЁВАЕ ЎТРЫМАННЕ З ЗАБЕСПЯЧЭННЕМ

### Рэнтавыя адносіны з дзяржавай: быць або не быць?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Пачынаючы з 2011 года ў Мінску праводзіцца эксперымент па ўкараненні новых фармаў сацыяльнага абслугоўвання. Адна з такіх навінак — прадастаўленне сацыяльных паслуг на аснове дагавора пажыццёвага ўтрымання з забеспячэннем (рэнта). Сёлета неабходна падвесці вынікі і вызначыць эфектыўнасць новай паслугі. А самае галоўнае — прыняць рашэнне, ці замацоўваць яе на заканадаўчым узроўні. Аб выніках эксперымента і высновах мы пагаварылі са старшынёй Камітэта па працы, занятасці і сацабароне Мінгарвыканкама Жаннай РАМАНОВІЧ.**

### ДЗЯРЖАВА ПАВІННА ЎСЁ ДАЦЬ БЯСПЛАТНА?

На сённяшні дзень, па словах Жанны Рамановіч, заключана 19 дагавораў мінчан аб рэнтавых адносінах з дзяржаўнымі ўстановамі па сацабслугоўванні Мінгарвыканкама. Па гэтую паслугу звярнуліся 28 чалавек, сярод якіх — пяць сямейных пар. З іх 10 чалавек па ўмовах дагавора абслугоўваюцца на даму, астатнія 10 пераехалі жыць у дом-інтэрнат для ветэранаў вайны і працы «Світанак».

— Усяго ў сталічным банку даных патэнцыйных атрымальнікаў рэнты — 700 чалавек. Практычна з кожным з іх сустракаліся юрысты, псіхолагі, сацыяльныя работнікі, якія тлумачылі пажылым людзям умовы дагавора, — кажа Жанна Рамановіч. — Невялікі працэнт тых, хто заключыў дагавор, абумоўлены некалькімі прычынамі. Адна з іх — тое, што адзінокія пажылыя людзі схільныя давяраць тым, каго яны добра ведаюць, г.зн. сваякам, суседзям і г.д. А тыя, у сваю чаргу, часам даносяць да іх скажоную інфармацыю, часта папросту настройваюць супраць. Заўсёды знойдуцца людзі, у якіх будуць свае віды на кватэру пажылога чалавека. Тут адбіваецца і менталітэт нашых пажылых грамадзян. Ім цяжка адважыцца на такі крок: гэта кватэра зароблена імі, а тут, па словах «добразычліўцаў», нібыта прапануецца, каб стары аддаў, падарыў гэтую кватэру дзяржаве. Але насамрэч права распараджацца жыллём пажылога чалавека горад набывае толькі пасля смерці апошняга.

Наступная прычына — утрыманская ўстаноўка нашых грамадзян: дзяржава павінна ўсё даць бясплатна, а кватэру яны адпішуць каму захочуць. Прыходзіць, напрыклад, жанчына на прыём і кажа: у мяне ёсць траюрадная сястра, і няхай яна далёкая сваячка, але ўсё ж сваячка. Лепш я адпішу кватэру ёй. Але ў такім выпадку вы і з просьбамі аб дапамозе павінны звярнуцца да сваёй сястры. Раз яна будзе карыстацца вашай маёмасцю, значыць, павінна ўзяць на сябе і клопат пра вас, хіба не так?

СТАР. 4

■ Надвор'е

## ТЫДЗЕНЬ «ХАЛОДНАГА» СОНЦА

### Уначы сіноптыкі прагназуюць замаразкі да мінус 8 градусаў

**На гэтым тыдні ў Беларусі будзе халаднавата і без дажджоў, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Сёння ўдзень на тэрыторыі краіны ў асноўным будзе гаспадарыць зона павышанага атмасфернага ціску. Таму ападкаў не будзе, а максімальная тэмпература паветра складзе плюс 5-11 градусаў. Чакаецца, што ў сераду праз нашу краіну, з поўначы на поўдзень, будзе праходзіць халодны атмасферны фронт, услед за якім пачне паступаць больш халоднае паветра паўночных шырот. У асобныя раёны ён прынясе невялікія ападкі — у асноўным дождж. Уначы і раніцай месцамі слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 4 градусаў, удзень — 2-9 цяпла.

У чацвер і пятніцу да нас завітае сапраўды жорсткі скандынаўскі антыцыклон, які прынясе халоднае і без ападкаў надвор'е. Уначы на чацвер тэмпература паветра складзе ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, па паўночным усходзе — мінус 6-8, удзень сонейка прыгрэе да 2-9 цяпла. Слабы туман месцамі чакаецца і ўначы на пятніцу.Тэмпература паветра складзе ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, па ўсходзе — да 7 марозу, удзень будзе ўсяго 1-8 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у выхадныя наша краіна застанецца пад уплывам антыцыклону, аднак разам з паўднёва-ўсходнімі вятрамі пачне паступаць больш цёплае паветра. Пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, пры праясненнях да мінус 6 градусаў. Удзень стане ўжо плюс 4-10 градусаў, а па захадзе — 11-13 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Супрацоўніцтва

# ДЛЯ ВЫРАШЭННЯ КЛЮЧАВЫХ ПЫТАННЯЎ СУЧАСНАСЦІ

**Учора прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў сустрэўся з памочніцай генеральнага сакратара ААН, намеснікам адміністратара Праграмы развіцця ААН, рэгіянальным дырэктарам па краінах Еўропы, СНД і Балтыі Джыхан Султанаглу.**

Андрэй Кабякоў адзначыў, што Беларусь займае актыўную пазіцыю на пляцоўцы ААН і лічыць яе адзінай універсальнай арганізацыяй на сусветнай арэне, адзіным інструментам прыняцця рашэнняў па ключавых пытаннях сучаснасці. «Адносіны Беларусі і ААН маюць самы цесны характар. Беларусь, як адна з дзяржаў — заснавальніц арганізацыі, займае паслядоўную некан'юнктурную пазіцыю ў падтрымку ААН», — падкрэсліў ён.

«Мы адстойваем цэнтральную ролю ААН у забеспячэнні ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця розных частак планеты», — дадаў прэм'ер-міністр.

У сваю чаргу Джыхан Султанаглу выказала думку, што Беларусь за апошнія гады дасягнула адавочнага прагрэсу ў сацыяльна-эканамічным развіцці, і гэтаму ёсць шмат доказаў. Напрыклад, нізкі ўзровень мацярынскай смяротнасці. Да таго ж яна адзначыла, што вельмі дынамічна развіваецца сталіца краіны, змяняецца яе знешні выгляд.

Таксама ў час сустрэчы была дадзена станоўчая ацэнка садзейнічанню, што аказваецца па лініі ПРААН па пытаннях інтэграцыі Беларусі ў сістэму сусветнага гандлю, укаранення сістэмы электроннага ўрада, гарманізацыі стандартаў абароны персанальных даных, пашырэння ўдзелу жанчын у палітычным і эканамічным жыцці краіны, павышэння эфектыўнасці выкарыстання электраэнергіі, пашырэння здаровага ладу жыцця, прафілактыкі ВІЧ/СНІД.

На сустрэчы таксама адзначана зацікаўленасць Беларусі ў далейшым пашырэнні супрацоўніцтва з ПРААН і іншымі арганізацыямі сістэмы ААН сацыяльна-эканамічнага профілю. ■

■ Парламенцкі дзённік

# ДЭПУТАТЫ ПАШЫРАЮЦЬ ДЫЯЛОГ

## Чэшскія парламентарыі ўпершыню наведалі Палату прадстаўнікоў

**Учора ў ніжняй палаце беларускага парламента дэлегацыю чэшскіх дэпутатаў сустракаў Віктар ГУМІНСКІ, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, кіраўнік рабочай групы па супрацоўніцтве з Парламентам Чэшскай Рэспублікі. Ён падкрэсліў, што такая прадстаўнічая дэлегацыя чэшскіх калег наведала нашу краіну ўпершыню. Узначальвае дэлегацыю кіраўнік міжпарламенцкай групы «Чэхія — Беларусь» Зузка БЕБАРАВА-РУЙБРАВА, старшыня Камітэта па петыцыях Палаты дэпутатаў Парламента Чэшскай Рэспублікі.**

Пачаткам новага этапу ў развіцці міжпарламенцкага беларуска-чэшскага дыялогу можна лічыць восень мінулага года, калі адбыўся афіцыйны візіт беларускай дэлегацыі ў гэту краіну на чале з Віктарам Гумінскім. Апроч таго, досыць паспяхова супрацоўнічаюць дэпутаты і на міжнародных пляцоўках. Задача, якую парламентарыі плануюць вырашыць падчас цяперашніх сустрэч — пашырыць супрацоўніцтва ва ўсіх сферах, перш за ўсё — гандлёва-эканамічнай, а таксама ў культуры, дзе дагэтуль няма адпаведнага пагаднення.

— Чэхія і Беларусь — не чужыя адна адной краіны, зусім нядаўна мы былі ў адной інтэграцыйнай прасторы, разам вырашалі агульныя задачы. Цяпер мы ў розных інтэграцыйных аб'яднаннях: Чэхія ў Еўрапейскім саюзе, Беларусь — у Еўразійскім эканамічным саюзе, але гэта не перашкаджае нам развіваць нашы адносіны па ўсіх кірунках, — сказаў Віктар Гумінскі, вітаючы гасцей. — Мы маем агульную гісторыю, шмат было і цяжкіх момантаў у лёсе нашых дзяржаў. Дастаткова сказаць, што 70 гадоў таму на тэрыторыі Еўропы апошні стрэл сусветнай вайны прагучаў ля Прагі і больш за 140 тысяч савецкіх воінаў, у тым ліку і беларусы, загінулі пры вызваленні тагачаснай Чэхаславакіі.

Намеснік старшыні ніжняй палаты беларускага парламента заўважыў, што Чэхія з'яўляецца для Беларусі важным партнёрам у Еўрапейскім саюзе. Летась па экспарце беларускіх тавараў Чэхія ўзнялася з 27-га на 23-е месца, тавараабарот склаў больш за 540 мільёнаў долараў. Сёння ў Беларусі працуюць 125 кампаній з удзелам чэшскага капіталу, адкрыта 16 афіцыйных прадстаўніцтваў чэшскіх кампаній. Як тавараабарот, так і прысутнасць чэшскага капіталу ў нашай краіне маюць тэндэнцыю да павелічэння.

Віктар Гумінскі асобна падзякаваў Надзвычайнаму і Паўнамоцнаму Паслу Чэшскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Мілану Экерту за ўклад у развіццё беларуска-чэшскіх адносін.

— Я ўпэўнены, што праграма вашага знаходжання ў Беларусі дапаможа вам лепш пазнаць нашу краіну, каб мы, як прадстаўнікі народа, на сваім парламенцкім узроўні маглі зрабіць тое, што ад нас залежыць, для развіцця як палітычнага дыялогу, так і гандлёва-эканамічных адносін, а таксама адносін у іншых сферах, — дадаў беларускі парламентарый, звяртаючыся да членаў дэлегацыі. — Упэўнены, што гэты візіт паслужыць пашырэнню дружбы паміж нашымі народамі і ўмацаванню ўсебаковых адносін паміж нашымі дзяржавамі.

У сваю чаргу, спадарыня Бебарава-Руйбрава падзякавала беларускім калегам за запрашэнне. Яна з задавальненнем заўважыла, што «вельмі доўгі час у Беларусь прыязджалі прадпрымальнікі» і цяпер «нарэшце, прыйшоў час абмяняцца вопытам на парламенцкім узроўні».

— Я памятаю пра тое, што ў гісторыі Беларусі былі цяжкія перыяды. Мы паважаем беларускі народ за ахвяры, якія былі прынесены падчас Другой сусветнай вайны, — сказала спадарыня Бебарава-Руйбрава. — Мне вельмі прыемна, што Беларусь і Чэхія ў нашы дні з'яўляюцца сапернікамі толькі ў хакеі, але не ў іншых сферах.

Чэшскі дэпутат падкрэсліла, што Чэхія, як і ўвесь Еўрапейскі саюз, глядзіць на Беларусь у кантэксце канфлікту паміж Украінай і Расіяй як на медыятара і чакае выканання ёю ролі стабілізатара сітуацыі. «Еўрапейскі саюз ацэньвае ваш прагрэс у выбарах, і вашы крокі па дэмакратызацыі грамадства, — дадала старшыня парламенцкага камітэта Чэхіі. — Мы тут не для таго, каб вас крытыкаваць, але выкарыстоўваць ваш вопыт і дзяліцца сваім».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
*medvedeva@zviazda.by* ■

■ Не прапусціце!

# ТУРАЎСКАЯ ВОСЕНЬ

## На радзіме Віктара Турава праходзіць кінатыдзень, прысвечаны яго памяці

У Магілёве Віктара Турава любяць, ім ганарацца. У горадзе ёсць вуліца, якая носіць яго імя, а на кінатэатры «Радзіма» ўсталявана памятная шыльда ў яго гонар. Сёлета 15-ты раз у горадзе на Дняпры праводзіцца тэлетыдзень «Тураўская восень», які па традыцыі стартаваў на плошчы Зорак у дзень нараджэння кінамастака. На сустрэчу з прыхільнікамі яго творчасці прыехалі старшыня Саюза кінематаграфістаў Беларусі Віктар Васільеў, рэжысёр і аператар Дзмітрый Зайцаў, вучань Віктара Турава — Аляксандр Анісімаў.

На працягу апошняга тыдня кастрычніка ў кінатэатрах «Радзіма» і «Чырвоная зорка» будзе паказаны дакументальны фільм пра яго творчасць, пройдзць 12 стужак славутага рэжысёра. Сярод іх і яго рэжысёрскі дэбют — фільм «Праз могілкі», які рашэннем ЮНЕСКА ўнесены ў спіс 100 найлепшых фільмаў свету пра Вялікую Айчынную вайну. Азнаёміцца з асноўнымі вехамі жыцця і творчасці Віктара Турава дапаможа фотавыстава, якая на працягу тэлетыдня будзе працаваць у фае кінатэатра «Радзіма».

Усе 26 фільмаў, якія Віктар Тураў зняў за сваё кароткае жыццё, складаюць залаты фонд беларускага кіно. Многія з іх адзначаны ўзнагародамі прэстыжных кінафестываляў, а яго імя ўключана у спіс 50 найлепшых рэжысёраў за ўсю гісторыю кінематографа.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю былога прэзідэнта Акадэміі навук БССР Мікалая Аляксандравіча БАРЫСЕВІЧА і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

**РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю Мікалая Аляксандравіча БАРЫСЕВІЧА, былога прэзідэнта Акадэміі навук БССР і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

■ Погляд



# МЯСЦОВЫЯ ВЫБАРЫ: УКРАІНСКІ СЦЭНАРЫЙ

**Мясцовыя выбары на Украіне заканамерна выклікалі вялізны інтарэс за яе межамі. Гэта галоўны чаканы іх вынік: своеасаблівы экзамен цяперашняй улады на здольнасць кантраляваць сітуацыю ў краіне, правёўшы ў ёй выбары на годным узроўні ў вельмі няпростай сітуацыі. Папярэдняе рэзюмэ: у дзейнай улады гэта амаль атрымалася. Чаму амаль? Для такой высновы ёсць наступныя падставы.**

Па-першае, яўка на выбары аказалася значна ніжэйшай за тую, што можна было чакаць. На выбарах 2010 года яна склала каля 45 працэнтаў ад ліку выбаршчыкаў. На выбарах 2015 года — 46,62 працэнта. Здавалася б, у наяўнасці відавочнае паляпшэнне. На справе — не. На выбарах 2010 года ўкраінцы ішлі ў дастаткова спакойнай атмасферы. Нягледзячы на сусветны фінансавы крызіс, які стартаваў у 2008 годзе, эканамічная сітуацыя ў краіне была нашмат лепшай, а палітычная адрознівалася даволі вялай дынамікай.

На выбарах 2015 года сітуацыя кардынальна адрознівалася. Стан эканомікі жудасны, ужо ёсць цэлыя гарады, дзе нармальнай з'яўляецца зарплата ў 20 долараў за месяц; хутка скарачаюцца магчымасці па сацыяльнай абароне грамадзян; імклівa расце беспрацоўе; у наяўнасці тэндэнцыя адтоку часткі насельніцтва за мяжу ў пошуках лепшага жыцця; і, нарэшце, у краіне ідзе поўнамаштабная грамадзянская вайна.

Такое становішча звычайна нараджае вялікі інтарэс выбаршчыкаў да палітыкі, паколькі многія менавіта ў ёй бачаць магчымасць выпраўлення сітуацыі ў лепшы бок. Палітыкай пачынаюць актыўна цікавіцца тыя, хто ў спакойныя часы наогул не жадаў мець з ёй нічога агульнага. Яўка ў 46,62 працэнта на выбарах з'яўляецца дрэнным дыягназам для Украіны. Яна азначае, што больш як палова выбаршчыкаў, нягледзячы на цікавасць да палітыкі, якая прачнулася ў сілу неабходнасці, лічаць няважным, хто пераможа на выбарах. А лічыць так яны могуць толькі па прычыне недаверу да дзяржаўнай улады, не нялзольнасці кардынальна палепшыць сітуацыю: вярнуць нармальныя заробкі, ранейшыя стандарты сацыяльнай абароны, эфектыўна змагацца з беспрацоўем, спыніць грамадзянскую вайну.



Небяспека ў тым, што такія сімптомы могуць прадказваць узнікненне новай рэвалюцыйнай сітуацыі, калі людзі, якія не давяраюць дзяржаўным органам, будуць гатовы выкарыстаць сілу ў спробе самастойна змяніць сітуацыю ў краіне. Асабліва небяспечна і тое, што менш за ўсё людзей прыйшло на выбары ў тых рэгіёнах, якія знаходзяцца ў найбольшай блізкасці да зоны вядзення баявых дзеянняў. У Данецкай і Луганскай абласцях на выбарчыя ўчасткі прыйшло толькі каля трэціны выбаршчыкаў.

Другой праблемай з'яўляюцца шматлікія парушэнні на выбарах, зафіксаваныя выпадкі збіцця членаў выбарчых камісій. Улада аказалася няздольнай забяспечыць нават працэс адэкватнага інфармавання насельніцтва аб выніках галасавання. Сродкі масавай інфармацыі напоўнены недакладнай інфармацыяй аб ходзе і выніках выбараў. Так, спачатку паведамлялася, што ў Лісічанску мясцовая выбарчая камісія прызнала, што выбары не адбыліся праз тое, што ў бюлетэнях назвы партый былі напісаны няправільна. Толькі раніцай наступілі паведамленні пра тое, што гэта недакладная інфармацыя і выбары ў горадзе прайшлі на ўсіх участках і адбыліся. Сітуацыя ў горадзе Сватаўскую аказалася яшчэ горшай. Там сапраўды з прычыны шматлікіх памылак у бюлетэнях выбары былі прызнаны несапраўднымі, што прымушае задумацца аб працэсе арганізацыі выбараў, пры якім нельга нават правільна арганізаваць працэс вырабу бюлетэняў.

У двух буйных гарадах краіны — Марыупалі і Краснаармейску — выбары наогул былі ў апошні момант адменены. Афіцыйнай прычынай сталі таксама граматычныя памылкі ў бюлетэнях, але ў многіх гэта выклікае сумненні, таму што, па папярэдніх прагнозах, у гэтых гарадах магла з вялікай перавагай перамагчы апазіцыйная дзейнай уладзе партыі. Давер да ўлады ў цэлым умацуецца, калі ў гэтых прыфрантавых гарадах усё ж будуць у найбліжэйшыя тыдні праведзены выбары, арганізаваныя на годным узроўні.

Сур'ёзным недахопам стала і тое, што выбары правялі па новым заканадаўстве, якое, на думку некаторых экспертаў, вельмі складанае для разумення ўсімі выбаршчыкамі.

Нягледзячы на гэтыя недахопы, Украіну ўсё ж можна павіншаваць з выбарамі. Пры ўсіх адзначаных праблемах гэта нашмат лепшы шлях для змены ўлады, чым «Майдан» або грамадзянская вайна.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук** ■

■ Адукацыя

# ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА — ПОЛЕ ДЛЯ ДЫПЛАМАТЫІ

**«Сёння 9 беларускіх універсітэтаў маюць дамоўленасці аб супрацоўніцтве з універсітэтамі Вялікабрытаніі, але гэтага, безумоўна, недастаткова. Нам бы хацелася пашырыць сумесныя адукацыйныя і навуковыя праграмы і разнастаіць тэматыку навуковых праектаў», — заявіў міністр адукацыі Міхаіл Жураўкоў падчас сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі ў Рэспубліцы Беларусь Брусам Бакнелам. Сустрэча адбылася ў сценах галоўнага адукацыйнага ведамства.**

Кіраўнік Міністэрства адукацыі звярнуў увагу на неабходнасць распрацоўкі новай сістэмы кваліфікацый, якая павінна быць сугучнай той, што выкарыстоўваецца ў краінах-партнёрах.

— Як вядома, гэты год знамянальны для Беларусі: наша краіна стала паўнапраўным членам Балонскага працэсу, што, безумоўна, адкрывае новыя перспектывы для развіцця нацыянальнай вышэйшай школы. У рамках Балонскага працэсу стаіць задача па гарманізацыі і збліжэнні адукацыйных праграм краін еўрапейскай адукацыйнай прасторы з улікам нацыянальных асаблівасцяў кожнай з іх. Беларусі цікавы вопыт Вялікабрытаніі, асабліва магістарскі ўзровень вышэйшай адукацыі, — адзначыў Міхаіл Жураўкоў. — Апошнім часам у нас актыўна развіваюцца праграмы ў галіне прыродазнаўчых навук, праводзяцца цікавыя навуковыя даследаванні, ёсць дасягненні. Беларусі ёсць што паказаць замежным калегам...

Брус Бакнел канстатаваў імклівае развіццё цесных кантактаў паміж краінамі, асабліва ў адукацыйнай сферы: «Менавіта адукацыя з'яўляецца тым надзейным правадніком, які спрыяе ўмацненню сувязяў паміж краінамі і па іншых напрамках», — заявіў ён. — Беларусь пасля ўступлення ў Балонскі працэс стала ў адзін шраг з іншымі краінамі ў фарміраванні еўрапейскай адукацыйнай прасторы, і яе вопыт у развіцці адукацыі, безумоўна, будзе ўсім карысны».

Падчас візіту Брус Бакнел перадаў Міхаілу Жураўкову запрашэнне для ўдзелу ў Сусветным адукацыйным форуме, які адбудзецца ў другой палове студзеня 2016 года ў Лондане. Гэтае мерапрыемства з'яўляецца штогадовым найбуйнейшым у свеце форумам міністраў адукацыі і экспертаў па пытаннях развіцця адукацыі ва ўмовах глабалізацыі свету. Падчас форуму будзе абмяркоўвацца будучыня адукацыйнай палітыкі, а таксама стратэгіі развіцця рэгіянальных і нацыянальных адукацыйных сістэм. Плануецца, што ў працы форуму прымуць удзел кіраўнікі і прадстаўнікі сістэм адукацыі больш як 80 краін свету, міжнародных арганізацый АЭСР, ЮНЕСКА, ЮНІСЕФ, вядучых універсітэтаў і кампаній, якія прадстаўляюць праграмныя прадукты і тэхніка-тэхналагічныя інавацыі для сістэмы адукацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zvizda.by*

## САЮЗНАЯ АЛІМПІЯДА ВЫЗНАЧЫЦЬ НАЙЛЕПШЫХ

**Заключны этап 10-й алімпіяды школьнікаў «Расія і Беларусь: гістарычнае і духоўнае адзінства» стартаваў на асенніх канікулах у Гомелі. У інтэлектуальных спаборніцтвах удзельнічаюць больш як 200 школьнікаў з 34 рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Арганізатарамі выступаюць Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрства адукацыі і навукі Расійскай Федэрацыі, а фінансаванне ажыццяўляецца з бюджэту Саюзнай дзяржавы.**

У спаборніцтвах удзельнічаюць навучэнцы X і XI класаў. Першы (адборачны) этап алімпіяды праводзіўся ў верасні ва ўсіх абласцях Беларусі, у Мінску, асобна ў Ліцэі БДУ і Мінскім сувораўскім ваенным вучылішчы, у суб'ектах Расійскай Федэрацыі і Цвярскім сувораўскім ваенным вучылішчы.

Праграма заключнага этапу ўключае правядзенне двух абавязковых тураў — комплексную работу па рускай мове і літаратуры і напісанне сачынення. Таксама ў школьнікаў ёсць магчымасць паўдзельнічаць і ў творчых конкурсах: рытарычнага майстэрства, выразнага чытання, конкурсе знатакоў і лінгвістычнай віктарыне. У склад журы ўвайшлі вядомыя беларускія і расійскія вучоныя, вядучыя выкладчыкі ўстаноў вышэйшай адукацыі, настаўнікі-практыкі.

Для ўдзельнікаў запланавана вялікая культурная і экскурсійная праграма, якая дазволіць навучэнцам, перш за ўсё расійскім школьнікам, пазнаёміцца з гістарычным мінулым і культурнымі традыцыямі беларускага народа.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Па-сямейнаму

# СВЯТОЧНЫ ВОЗ, ВЯСКОВАЯ ЭСТАФЕТА І ПАДКОВА ШЧАСЦЯ

## На Гродзеншчыне фінішаваў рэспубліканскі конкурс «Уладар сяла — 2015»

**Фінал чарговага конкурсу адбыўся ў вобласці, прадстаўнікі якой першынствавалі на папярэднім. Дарэчы, сям'я Скорб (Дзмітрый, Алена, дзеці Дзіяна і Аляксандр) з аграгарадка Дэмбрава Шчучынскага раёна ўжо двойчы перамагла ў гэтым праекце! І, зразумела, яны ўсе разам прыехалі ў Гродна — цяпер ужо ў якасці гледачоў.**



Фота БЕЛТА.

**ДАВЕДКА**

*Ідэйны натхняльнік і арганізатар сямейнага сельскагаспадарчага праекта «Уладар сяла» — Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Конкурс падтрымліваюць выканаўчыя камітэты, міністэрствы сельскай гаспадаркі і харчавання, адукацыі, Белаграпрамбанк, Беларускі саюз жанчын.*

*Упершыню конкурс «Уладар сяла» прайшоў у Глыбоцкім раёне ў 2007 годзе. А з 2008-га маладзёжная ініцыятыва ўвасобілася ў рэспубліканскі сямейны сельскагаспадарчы праект. Фіналу папярэднічаюць раённыя і абласныя этапы. Удзельнічаюць маладыя сем'і (муж і жонка, іх дзеці), якія жывуць і працуюць у сельскай мясцовасці не менш за тры гады.*

Праграма фінальнага этапу праекта распачалася яшчэ да прыезду яго ўдзельнікаў у горад над Нёманам з інтэрнэт-конкурсу «Найлепшы сельскі падворак». Усе сем'і падрыхтавалі відэаролікі пра сваё паўсядзённае жыццё, клопаты, захапленні, і кожны інтэрнэт-карыстальнік партала «Моладзь Беларусі» (brsm.by), аднайменнай групы БРСМ у сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» і відэахостынга YouTube мог стаць членам журы. Вынікі народнага галасавання ішлі ў агульны конкурсны залік.

Маладзёжнае свята ўрачыста адкрылася з цырымоніі ўручэння боханаў новага ўраджаю. Святочную атмасферу стварылі творчыя калектывы Гродзеншчыны і шматлікія гледачы, у тым ліку групы падтрымкі кожнай сям'і. Сімвалічна, дарэчы, што гэта адбывалася ў маладзёжным цэнтры «Гродна», пабудаваным у рамках праекта «100 ідэй для Беларусі». Гэтую ініцыятыву фінансава падтрымалі абласныя ўлады, а ў будаўніцтве цэнтра ўдзельнічалі студэнцкія атрады.

Каманды паспаборнічалі ў колцы і ўкладцы дроў, у вясковай эстафеце (тут, як і ў сямейным жыцці, асабліва патрабавалася зладжанасць), у запраганні каня. А ў конкурсе «Драўляныя спраў майстар» мужчынам трэба было вырабіць для сваёй жонкі кухонную дошку з дапамогай толькі сякеры. Дарэчы, штогод арганізатары праекта ўключаюць у праграму фінальнага этапа нейкую чарговую «фішку», і сёлета ёй стаў конкурс «Падкова шчасця». Гэты сімвал удачы і сямейнага дабрабыту канкурсанты вырабілі ў кавальскай майстэрні аграгтурыстычнага комплексу «Каробчыцы», дзе, дарэчы, правялі майстар-клас для ўсіх ахвотных.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

**ДУМКА Ў ТЭМУ**

**Андрэй БЕЛЯКОЎ, першы сакратар Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі»:**

*— Калі гэты конкурс стартаваў, то не ўсе рэгіёны ўдзельнічалі — пэўна, спачатку прыглядаліся. А цяпер праект «Уладар сяла» ўжо набыў сапраўдны рэспубліканскі маштаб. Штогод у яго раённых, абласных і фінальным этапах удзельнічаюць сотні маладых сем'яў з усіх куткоў нашай краіны, прычым робяць гэта з задавальненнем, нікога не трэба прымушаць. Больш за тое, у гэты працэс уключаюцца не толькі яны, але і многія іншыя людзі, пачынаючы ад жыхароў вёскі ці аграгарадка, адкуль сям'я, і заканчваючы абласнымі і рэспубліканскімі структурамі, у тым ліку і БРСМ. Гэта сёння агульная справа, скіраваная на папулярызацыю сямейных каштоўнасцяў, сельскага жыцця і замацаванне маладых спецыялістаў на вёсцы. Дарэчы, сярод сённяшніх канкурсантаў мы бачылі і былых гараджан, якія перабраліся ў сельскую мясцовасць і гарманічна ў яе «ўпісаліся».*

*Вельмі важна і тое, што праект «Уладар сяла» папулярызуе традыцыі беларускай вёскі, здаровы лад жыцця ў маладзёжным асяроддзі, генерыруе не толькі гаспадароў, але і творчых здольнасцей канкурсантаў. Відавочна, што гэты праект вельмі запатрабаваны ў моладзі, а значыць, яму быць і надалей!*

■ Спорт-тайм

# НЕ АПРАЎДАЛІ НАДЗЕЙ

**Натуралізаваныя гімнасткі па выніках мнагаборства ўвайшлі толькі ў восьмы дзясятак на чэмпіянаце свету ў Глазга, Вікторыя Азаранка паднялася на адзін радок у сусветным рэйтынгу, а Міхаіл Грабоўскі адкрыў лік шайбам у сёлетнім чэмпіянаце НХЛ. Пра найбольш актуальныя навіны спорту — у штотыднёвым агляздзе «Звязды».**

**1. У брытанскім Глазга праходзіць 46-ты чэмпіянат свету па спартыўнай гімнастыцы,** які з'яўляецца кваліфікацыйным турнірам да Алімпійскіх гульняў—2016 у Бразіліі.

У кваліфікацыі мнагаборства сярод жанчын Беларусь прадстаўлялі натуралізаваныя амерыканскія гімнасткі. Іх выступленні складана назваць удалымі: Алаіна Кван заняла толькі 73-е месца, а Кейлі Дыксан апынулася на 75-й выніковай пазіцыі. Усяго ў кваліфікацыйным турніры прынялі ўдзел 190 гімнастак. Нашу мужчынскую зборную на чэмпіянаце свету прадстаўляюць Андрэй Ліхавіцкі, Дзмітрый Баркалаў, Ілья Якаўлеў, Васіль Міхаліцын, Андрэй Царэвіч, Дзяніс Санувонг і Аляксандр Даронін. Яны таксама застаюцца без прызавых месцаў.

Восем топавых камандаў ужо сёлета атрымаюць пуцёўкі ў Рыа. У камандаў, якія занялі месцы з 9-га па 16-е, будзе шанц пазмагацца за 4 ліцэнзіі на перадалімпійскіх стартах у красавіку наступнага года. Спартсмены, якія занялі прызавыя месцы на асобных снарадах і не ўвайшлі ў лік камандаў першай васьмёркі, таксама гарантуюць сабе месца ў ліку ўдзельнікаў галоўных стартаў чатырохгоддзя. Але гэтыя ліцэнзіі не імянныя, а на краіну.

Адзначым, што ў гэтым чэмпіянаце планеты прымаюць удзел каля 600 спартсменаў з 87 краін, што з'яўляецца рэкордам для падобных турніраў.

**2. Беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка паднялася на адзін радок у абноўленым рэйтынгу WTA** і займае цяпер 22 месца. Аляксандра Сасновіч захавала за сабой 103-ю пазіцыю. Лідзіруе ў рэйтынгу амерыканка Серэна Уільямс, румынка Сімона Халеп займае другое месца, а іспанка Гарбіне Мугуруса — на трэцім радку.

**3. Міхаіл Грабоўскі закінуў сваю першую шайбу ў новым сезоне чэмпіянату НХЛ.** Тым самым беларус прынёс перамогу сваёй камандзе «Нью-Ёрк Айлэндэрз» і быў прызнаны першай «зоркай» паядынку з «Сент-Луісам».

На рахунку Міхаіла ў 8 матчах сёлетняга чэмпіянату 4 (1+3) балы пры паказчыку карыснасці «+5», 2 хвілінах штрафу і сярэднім гульнявым часе 13 хвілін 2 секунды.

**4. Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова ў хатнім матчы Лігі чэмпіёнаў разграміў «Порту» — 34:27.** Перамога над партугальскай дружынай дазволіла брэсцкаму гандбольнаму клубу заняць другое месца ў турнірнай табліцы.



Фота БЕЛТА.

— Наперадзе яшчэ шмат матчаў. Мы выканалі задачу мінімум — пакінулі шанцы на выхад з групы. На жаль, праз траўмы пасля гэтага матча страцілі шмат гульцоў, — адзначыў **галоўны трэнер Сяргей БЯБЕШКА.**

Наступны матч у Лізе чэмпіёнаў беларускі клуб правядзе 14 лістапада на выездзе супраць «Вайводзіны». Да гэтага «мяшкоўцам» трэба будзе згуляць у SEHA-лізе дома з македонскім «Вардарам» 28 кастрычніка і 1 лістапада — з харвацкім «Нексе». У гэтым турніры БГК пасля шасці тураў займае трэцюю пазіцыю.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*



## УВАГА, ПРАМАЯ ЛІНІЯ!

**Паляўнічыя і рыбаловы, рыхтуйце пытанні!**

**30 кастрычніка з 11 да 12 гадзін**

на пытанні чытачоў «Звязды» адкажа старшыня Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў **Юрый Іванавіч ШУМСКІ.**

Папярэдне пытанні можна пакінуць па адрасе pryroda@zviazda.by або па нумары (017) 287-18-38.



# НА ПАЖЫЦЦЁВАЕ ЎТРЫМАННЕ З ЗАБЕСПЯЧЭННЕМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Але, акрамя гэтага, ёсць і аб'ектыўныя прычыны. Напрыклад, недасканаласць нашага заканадаўства ў гэтай галіне. Таму што любы грамадзянін, які дасягнуў 65-гадовага ўзросту або мае групу інваліднасці, мае права на пражыванне ў доме-інтэрнаце агульнага тыпу на поўным дзяржаўным забеспячэнні. У тым ліку маюць такое права і грамадзяне, ва ўласнасці якіх маюцца кватэры, жылыя дамы і г.д.

Так, у заканадаўства ўнесена норма, што калі ў апошнія тры гады чалавек правёў адчужэнне жылога памяшкання, то ён паступае ў інтэрнатную ўстанову на платнай аснове. І што робяць нашы грамадзяне? Вось свежы прыклад: 15 жніўня гэтага года мінае тры гады з моманту адчужэння кватэры (якую пажылы чалавек падарыў сваякам), і роўна праз месяц, 15 верасня, у нас на стале ляжаць яго дакументы, каб змясціць яго ў дом-інтэрнат на поўнае дзяржаўнае забеспячэнне. Сваякі вытрымалі роўна тры гады і адзін месяц! У такіх выпадках пажылы чалавек, як правіла, трапляе да нас з яшчэ большай колькасцю хвароб, часта ў душэўна спустошаным стане, таму што сваякі не забяспечвалі яму належнага догляду.

## «МЫ ЛІЧЫМ, ШТО ГЭТА МАГЧЫМАСЦЬ КАМФОРТНАГА ЖЫЦЦЯ ДЛЯ СТАРЫХ»

І ўсё ж якая пазіцыя Камітэта па працы, занятасці і сацабароне Мінгарвыканкама? Быць ці не быць рэнтавым адносінам пажылых беларусаў з дзяржавай? «Наша пазіцыя адназначная: быць! — сцвярджае старшыня камітэта. — Мы лічым, што рэнта — гэта магчымасць камфортнага жыцця для нашых старых пад кантролем дзяржавы. Але мы будзем улічваць і звесткі сацапытання мінчан».

> **Сацапытанне**
>
> ### Ваша думка важная
>
> **З мэтай вывучэння поглядаў мінчан на мэтазгоднасць і магчымасць далейшай рэалізацыі гэтай сацыяльнай паслугі Камітэт па працы, занятасці і сацабароне Мінгарвыканкама праводзіць апытанне сярод жыхароў сталіцы. Апытальнікі размешчаны на сайце «Звязды» www.zviazda.by, раённых сайтах адміністрацый сталіцы, на сайтах Камітэта па працы, занятасці і сацабароне і Мінпрацы і сацабароны Беларусі.**

Жанна Рамановіч расказала таксама, што трэба змяніць, каб такая паслуга была запатрабаванай і карысталася папулярнасцю ў мінчан.

— Мы кажам, што эксперымент рэнтабельны — як пры пражыванні пажылога чалавека ў перададзенай пад рэнту кватэры, так і ў стацыянарнай установе сацабслугоўвання. Умовы дагавора рэальныя для выканання ўстановамі сацыяльнага абслугоўвання. Гэта значыць, на сённяшні дзень наяўныя ў нас матэрыяльныя і працоўныя рэсурсы дазваляюць забяспечыць належны догляд і камфортныя ўмовы пражывання кожнаму грамадзяніну, які заключыў з дзяржаўнымі ўстановамі па сацабслугоўванні Мінгарвыканкама дагавор пажыццёвага ўтрымання (рэнты).

Але разам з тым у найбліжэйшай будучыні, па словах Жанны Рамановіч, неабходна ўнесці змены ў заканадаўства ў частцы ўзмацнення



жорсткасці патрабаванняў пры накіраванні людзей у інтэрнатныя ўстановы.

— Мы будзем настойваць на тым, што грамадзяне, якія маюць або мелі ва ўласнасці жылыя памяшканні, павінны размяшчацца ў інтэрнаты толькі на платных умовах альбо пераходзіць на заключэнне дагавора пажыццёвага ўтрымання з забеспячэннем. Такім чынам мы выключым утрыманства і прымусім сваякоў клапаціцца аб сваіх старых. Дарэчы, дзякуючы нашаму эксперыменту мы ўжо аднавілі сацыяльныя сувязі большасці пажылых грамадзян, і гэта немалаважна. Частка сваякоў успомнілі пра гэтых старых і сталі дапамагаць ім і падтрымліваць.

З мэтай пашырэння кантынгенту атрымальнікаў рэнты Камітэт па працы, занятасці і сацабароне Мінгарвыканкама прапануе знізіць узрост патэнцыйнага рэнтаатрымальніка. Сёння ім можа стаць грамадзянін, які дасягнуў 70-гадовага ўзросту. «Мы прапануем знізіць узрост да 65 гадоў, паколькі ў гэтым узросце людзі ўжо атрымліваюць правы паступаць у інтэрнатную ўстанову, — кажа старшыня камітэта. — І яшчэ адна прапанова: працаваць і з пажылымі людзьмі, у якіх маюцца сваякі ці трэція асобы, па законе абавязаныя іх утрымліваць, калі апошнія дадуць згоду, завераную натарыяльна, што яны не пярэчаць супраць гэтага дагавора і не будуць прэтэндаваць на кватэру. У нас ужо ёсць такія просьбы ад людзей. Напрыклад, ад пенсіянераў, дзеці якіх жывуць далёка за мяжой і не маюць ніякіх прэтэнзій на кватэру сваіх бацькоў».

***

Апошнім часам некаторыя пажылыя людзі заключаюць дагавор рэнты з фізічнымі асобамі. «Я не супраць, калі хтосьці дагледзіць старога чалавека прыватным чынам, заключыўшы дагавор рэнты, — сцвярджае Жанна Рамановіч. — Іншае пытанне: якім будзе гэты догляд? Ці будзе забяспечана пажылому чалавеку камфортная старасць? У нас ёсць звароты ад пажылых людзей, якія заключылі такі дагавор з фізічнай асобай і цяпер не могуць яго скасаваць. Абуральны выпадак: у Ленінскім раёне пражывае пажылая жанчына, якая заключыла дагавор рэнты з жыхаром Мінскай вобласці. Ён, карыстаючыся недасведчанасцю жанчыны, прапісаў ва ўмовах дагавора, што будзе штомесяц плаціць ёй арэндную плату ў памеры 35 тысяч рублёў (такой была базавая велічыня на момант падпісання дагавора). І вось ён і цяпер выплачвае ёй штомесяц гэтыя 35 тысяч рублёў! Юрысты толькі разводзяць рукамі: усё па законе, так прапісана ў дагаворы. І ніякіх прэтэнзій да гэтага чалавека прад'явіць нельга!

Першы дагавор рэнты з Мінгарвыканкамам быў складзены ў лютым 2012 года. Сёння, паўтаруся, у нас ужо 19 такіх дагавораў. І ніводнай скаргі ад людзей мы не атрымалі. У цэлым, карыстацца пажылому чалавеку нашымі паслугамі ці не — гэта яго выбар. Задача органаў сацыяльнай абароны — забяспечыць кожнаму грамадзяніну камфортныя ўмовы пражывання.

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

> На думку парламентарыя
>
> ### ГЭТА ВЫКЛЮЧАЕ АШУКАНСКІЯ СХЕМЫ
>
> **Намеснік старшыні Пастаяннай Камісіі па працы і па сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Зінаіда МАНДРОЎСКАЯ:**
>
> Прапануючы гэтую сацыяльную паслугу, дзяржава бярэ на сябе вялікія абавязацельствы. Гэта выключае ашуканскія схемы, калі нячыстыя на руку людзі пачынаюць «апрацоўваць» пажылога чалавека з мэтай завалодвання яго жыллём.
>
> Але вельмі важна, каб дзяржава была гатова ўзяць на сябе такія абавязацельствы. Трэба мець дастаткова месцаў з выдатнымі ўмовамі, дзе можна будзе размясціць людзей, якія гатовыя завяшчаць сваю кватэру дзяржаве. Бо кватэра застаецца ў іх да іх смерці, і дзяржава павінна пры жаданні пажылых людзей накіраваць іх у камфортныя ўмовы. Пры гэтым яны будуць працягваць атрымліваць сваю пенсію.
>
> Я лічу, гэта нармальна, калі пажылы чалавек можа сам вызначыцца і зрабіць выбар, як яму жыць. Дзяржава дае яму цяпер такую магчымасць. Калі чалавек хоча, яго могуць дагледзець сваякі, калі ён адзінокі — можа ўступіць у рэнтавыя адносіны з фізічнай асобай або з дзяржавай. Я лічу, трэба тлумачыць людзям, што дзяржава прапануе не кабалу, не нейкую ашуканскую схему, а нармальны догляд у нармальных умовах у абмен на кватэру. У любым выпадку — гэта добрае выйсце для адзінокага чалавека.

> ### БУДЗЬЦЕ Ў КУРСЕ!
>
> Згодна з пастановай Савета Міністраў № 738 ад 08.06.2011, грамадзяне, якія дасягнулі 70-гадовага ўзросту, маюць ва ўласнасці жыллё і не маюць трэціх асоб, якія па законе абавязаны іх утрымліваць, могуць заключыць дагавор пажыццёвага ўтрымання з забеспячэннем (рэнты), пасля чаго атрымліваюць правы бясплатнага пражывання ў гарадскім доме-інтэрнаце для ветэранаў вайны і працы «Світанак» або сацыяльнага абслугоўвання на даму і атрымання ад дзяржавы грашовых сум — выплат рэнты за кватэру.
>
> Правы распараджацца жыллём горад набывае толькі пасля смерці грамадзяніна, які з'яўляецца атрымальнікам рэнты.
>
> **Гарантыі для атрымальнікаў рэнты з боку дзяржавы:**
>
> **1.** Аплата натарыяльных паслуг пры заключэнні дагавора.
>
> **2.** Штомесячныя плацяжы ў памеры 1-3 базавых велічынь (з 1.01.2015 года гэтая выплата складае 180 — 540 тысяч руб., у залежнасці ад умоў дагавора і кошту перададзенага жылля).
>
> **3.** Адлічэнні на капітальны рамонт за жылое памяшканне; на аплату камунальных паслуг.
>
> **4.** Тэхнічнае абслугоўванне жылога памяшкання.
>
> **5.** Аказанне сацыяльных паслуг сацыяльным работнікам 5 разоў на тыдзень.
>
> **6.** Аказанне паслуг па пахаванні і іншыя ўмовы.
>
> У выпадку заключэння дагавора пажыццёвага ўтрымання з забеспячэннем пражывання ў доме-інтэрнаце для ветэранаў вайны і працы «Світанак» пажылому чалавеку прадастаўляюць асобнае жылое памяшканне (пакой), рацыянальнае 4-разовае харчаванне, кругласутачнае медыцынскае назіранне і медабслугоўванне, тэхнічныя сродкі догляду і рэабілітацыі, арганізаваны культурны адпачынак з наведваннем устаноў культуры, дадатковыя бытавыя паслугі — з захаваннем пенсіі ў поўным памеры і выплатай рэнты.

■ Узровень

# АД ЛЯСНОЙ ГАСПАДАРКІ — ДА ПАЛІГРАФІІ І ФАРМАЦЭЎТЫКІ

**Менавіта па такім шырокім спектры спецыяльнасцяў рыхтуюць прафесіяналаў у Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце. Учора адбыліся ўрачыстасці, прысвечаныя яго юбілею.**



Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў адной з самых буйных вышэйшых навучальных устаноў краіны з 85-годдзем. «За час існавання ВНУ тут падрыхтавана больш за 75 тысяч кваліфікаваных спецыялістаў, якія паспяхова працуюць у лясной, дрэваапрацоўчай, будаўнічай, хімічнай, мікрабіялагічнай, фармацэўтычнай галінах, у паліграфічнай і электроннай прамысловасці, навуцы і адукацыі. Перакананы, што назапашаны вопыт і добрыя традыцыі дазволяць калектыву ВНУ і далейшым дабівацца высокіх вынікаў у навукова-педагагічнай і практычнай дзейнасці», — падкрэсліваецца ў віншавальным звароце.

Сёння ўніверсітэт з'яўляецца базавай арганізацыяй дзяржаў — удзельніц СНД па адукацыі ў галіне лясной гаспадаркі і лясной прамысловасці, а таксама паўнапраўным членам Міжнароднага цэнтра лясной гаспадаркі і лясной прамысловасці.

БДТУ першым з беларускіх ВНУ атрымаў сертыфікаты адпаведнасці сістэмы менеджменту якасці патрабаванням нацыянальнай (СТБ ІСО 9001-2009) і нямецкай (DIN EN ISO 9001-2008) сістэм сертыфікацыі. У 2011 годзе ўніверсітэту была прысуджана Прэмія ўрада Рэспублікі Беларусь у галіне якасці за ўкараненне высокаэфектыўных метадаў кіравання якасцю і аказанне канкурэнтаздольных паслуг.

У 2012 годзе падчас наведвання ўніверсітэта Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь Міхаілам Мясніковічам было вырашана ўтварыць на базе БДТУ вучэбна-навукова-вытворчы комплекс, які прадугледжвае скразную сістэму падрыхтоўкі кадраў, а таксама стварэнне новых навуковых структур розных накіраванасці. А ўжо ў сакавіку 2013-га была прынята пастанова Савета Міністраў, згодна з якой пяць каледжаў далучыліся да БДТУ як адасобленыя падраздзяленні.

У рамках Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь БДТУ сумесна з вядучымі прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі стварыў 34 вучэбна-навукова-вытворчыя цэнтры, адкрыў 15 філіялаў кафедраў на буйных прадпрыемствах: на «Кераміне», «Холдынгавай кампаніі «Пінскдрэў», «Мінскім трактарным заводзе», «Белмедпрэпаратах», «Беллесасахове». Звыш 870 арганізацый з'яўляюцца базамі для праходжання студэнтамі практыкі.

Ва ўніверсітэце актыўна пашыраецца навукоавая і развіваецца практыка-арыентаваная магістратура. Так, з 2011 года тут дзейнічае адзіная ў нашай краіне праграма дыстанцыйнай падрыхтоўкі спецыялістаў другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратура), якую БДТУ рэалізуе сумесна з Вільнюскім універсітэтам імя Гедымінаса. Магістранты спецыяльнасці «Кіраванне нерухомасцю», якія навучаюцца па гэтай праграме, маюць магчымасць вывучаць замежны вопыт у сваёй прафесійнай галіне і, прайшоўшы двухгадовы курс навучання, атрымаць два дыпломы: беларускі і еўрапейскі.

Развіццё міжнародных сувязяў з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці тэхналагічнага ўніверсітэта. Сярод замежных партнёраў БДТУ — 118 адукацыйных і навукова-даследчых устаноў з 29 краін свету.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Фінансы

# ДАВЕСЦІ ІНФЛЯЦЫЮ ДА АДНАЗНАЧНАЙ ВЕЛІЧЫНІ

**Перспектывы ўкаранення міжнародных стандартаў у плацежную сістэму нашай краіны былі разгледжаны на пашыраным пасяджэнні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі. Таксама на мерапрыемстве былі падведзены вынікі выканання асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі дзяржавы за студзень—верасень і задачы банкаўскай сістэмы па іх далейшай рэалізацыі.**

### ТРЭНД НА ЗАПАВОЛЬВАННЕ РОСТУ СПАЖЫВЕЦКІХ ЦЭН

Як адзначалася на пасяджэнні, сёлета асноўныя меры эканамічнай палітыкі, якія рэалізуюцца ўрадам і Нацыянальным банкам, накіраваны на зніжэнне сфарміраванага раней макраэканамічнага дысбалансу. Пры гэтым рэалізацыя такіх захадаў ажыццяўляецца ў складаных умовах, якія фарміруюцца, перш за ўсё, пад уздзеяннем неспрыяльных знешніх фактараў.

Спецыялісты банкаўскага сектара адзначаюць, што сёлета грашова-крэдытная палітыка разам з мерамі па аптымізацыі ўнутранага попыту спрыяла запавольванню інфляцыйных працэсаў. Дынаміка іх на працягу 9 месяцаў сёлета характарызавалася ўстойлівай тэндэнцыяй да зніжэння. Так, прырост спажывецкіх цэн у гадавым вымярэнні знізіўся з 17,1 працэнта ў студзені да 11,9 працэнта ў верасні і з II квартала знаходзіцца ніжэй за абвешчаны мэтавы параметр на 2015 год.

### ВЫЙШЛІ НА СТАНОЎЧАЕ САЛЬДА ПА ЗНЕШНІМ ГАНДЛІ

Рэалізацыя комплексу захадаў па павышэнні збалансаванасці знешняга гандлю і эканомікі ў цэлым прывяла да фарміравання па выніках 8 месяцаў бягучага года станоўчага сальда знешняга гандлю ў аб'ёме 1,4 млрд долараў ЗША і, як вынік, істотнага зніжэння дэфіцыту бягучага рахунку — з 6,9 да 1,7 працэнта ВУП. Паляпшэнне збалансаванасці знешняга гандлю і вяртанне рэальнага эфектыўнага абменнага курсу да свайго раўнаважнага ўзроўню з'яўляліся вызначальнымі фактарамі падтрымання стабільнай сітуацыі на валютным рынку краіны.

### НАСЕЛЬНІЦТВА ВАЛЮТЫ БОЛЬШ ПРАДАЕ, ЧЫМ КУПЛЯЕ

На пасяджэнні было адзначана, што па выніках 9 месяцаў сфарміравалася чыстая прапанова валюты з боку насельніцтва на фоне парытэту попыту і прапановы ў сегменце прадпрыемстваў. Станоўчую ролю ў гэтым адыграў і новы рэжым курсаўтварэння, які дазваляе своечасова згладжваць уплыў негатыўных фактараў на валютны рынак, паведамляе служба Нацбанка.

Сітуацыя на валютным рынку шмат у чым задавала дынаміку прамежкавага арыенціра манетарнай палітыкі — сярэдняй шырокай грашовай масы. Сёлета ў верасні яе фактычны прырост у гадавым вымярэнні склаў 40,7 працэнта. Асноўнай прычынай росту гэтага паказчыка стала пераацэнка валютнага складніка ў выніку паскоранага паслаблення абменнага курсу беларускага рубля. А вось па фіксаваным курсе параметр па прыросце грашовай прапановы вызначаецца ў значна меншых памерах, чым па прагнозе, і складае 0,4 працэнта.

Паводле ацэнак Нацыянальнага банка, ужо ў I квартале 2016-га ступень ўздзеяння курсавога складніка на дынаміку шырокай грашовай масы істотна паменшыцца, і яна ўшчыльную наблізіцца да вызначанага параметра прамежкавага арыенціра.

### ПАМЯНШЭННЕ ПРАЦЭНТНЫХ СТАВАК І СКАРАЧЭННЕ ДОЛІ «ГАРАЧЫХ» УКЛАДАЎ

Стабільная сітуацыя ў фінансавай сферы задавала трэнд ставак грашовага і крэдытна-дэпазітнага рынкаў на зніжэнне, арыентуючыся на які Нацыянальны банк паэтапна зніжаў працэнтныя стаўкі па сваіх інструментах рэгулявання ліквіднасці.

Сітуацыя на дэпазітным рынку ў студзені—верасні характарызавалася рознанакіраванай дынамікай і складвалася ў тым ліку пад уплывам захадаў, якія прымаліся для перафарматавання наяўнай рэсурснай базы банкаў у рамках выбранай Нацыянальным банкам стратэгіі па зніжэнні долі «гарачых» укладаў. У цэлым за 9 месяцаў тэрміновыя рублёвыя дэпазіты насельніцтва павялічыліся на 1,8 трлн рублёў. Пры гэтым толькі за перыяд з сакавіка па верасень удзельная вага дэпазітаў тэрмінам ад 1 да 3 гадоў у агульным аб'ёме прыцягнутых сродкаў узрасла з 12 да 25 працэнтаў.

Такім чынам, улічваючы дзейснасць праведзеных змен у грашова-крэдытнай палітыцы, Нацыянальны банк мае намер захаваць пераемнасць падыходаў да яе рэалізацыі сёлета і ў наступным годзе. Тут асноўныя намаганні па-ранейшаму будуць накіраваны на запаволенне інфляцыі і выхад у сярэднетэрміновай перспектыве на яе адназначную велічыню. Дасягненне гэтай мэты будзе забяспечвацца шляхам кантролю над грашовай прапановай. У якасці прамежкавага арыенціра манетарнай палітыкі плануецца выкарыстоўваць шырокую грашовую масу, аперацыйнага арыенціра — праз прырост рублёвай грашовай базы.

### СТАЎКА НА РЫНАЧНЫ АБМЕННЫ КУРС

На пасяджэнні было адзначана, што ў нашай краіне прадоўжыцца рэалізацыя бягучай гнуткай курсавой палітыкі, якая сфакусіравана на павышэнні ролі рыначных механізмаў у фарміраванні абменнага курсу. Рэалізацыя працэнтнай палітыкі будзе забяспечваць захаванасць грошай ад абясцэнення і адначасовае зніжэнне рызыка-прэміі, закладзенай у даходнасць дэпазітаў і кошт крэдытаў.

### СТВАРАЕЦЦА КАНЦЭПЦЫЯ РАЗВІЦЦЯ ПЛАЦЕЖНАЙ СІСТЭМЫ БЕЛАРУСІ НА 2016—2020 ГОДЫ

Адным з прыярытэтных напрамкаў у дзейнасці Нацыянальнага банка ў найбліжэйшай перспектыве па-ранейшаму застанецца ўкараненне міжнародных стандартаў у плацежную сістэму краіны.

Як было адзначана ў ходзе пасяджэння, плацежная сістэма Беларусі першапачаткова стваралася на аснове рэкамендацый міжнародных стандартаў, якія ўвабралі ў сябе найлепшыя практыкі і вопыт пабудовы эфектыўных і надзейных плацежных сістэм ва ўмовах рыначнай эканомікі. Цяпер у якасці базавых арыенціраў па забеспячэнні эфектыўнага, надзейнага і бяспечнага функцыянавання плацежнай сістэмы Нацыянальным банкам вызначаны прынцыпы для інфраструктур фінансавага рынку (ІФР), апублікаваныя камітэтам па плацежных і разліковых сістэмах Банка міжнародных разлікаў і Міжнароднай арганізацыяй камісій па каштоўных паперах у красавіку 2012 года.

Прынцыпы ІФР уяўляюць сабой 24 указанні па кіраванні рызыкамі і забеспячэнні эфектыўнасці інфраструктуры фінансавага рынку і ўключаюць мінімальныя патрабаванні да ўсіх значных плацежных сістэм. Для цэнтральных банкаў, рэгулятараў рынку і іншых кампетэнтных органаў у галіне інфраструктур фінансавага рынку прынцыпы ІФР вызначаюць пяць абавязкаў па эфектыўным кіраванні, наглядзе і назіранні за інфраструктурамі.




На пасяджэнні было згадана, што ў 2014 годзе Нацыянальны банк правёў самаацэнку захавання прынцыпаў ІФР у сістэме BISS як сістэмна значнай. Вынікі ацэнкі паказалі, што на сённяшні дзень у сістэме BISS няма істотных праблем, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння. Асноўнае нявырашанае пытанне — частковае захаванне прынцыпу 22 «Працэдуры і стандарты перадачы паведамленняў», якім прадугледжана забеспячэнне сумяшчальнасці з міжнароднымі працэдурамі і стандартамі перадачы паведамленняў. Для дасягнення адпаведнасці сістэмы BISS прынцыпу 22 Нацыянальным банкам праводзяцца планамерныя мерапрыемствы па ўкараненні ў плацежную сістэму краіны метадалогіі міжнароднага стандарту ISO 20022 «Фінансавыя паслугі. Універсальная схема паведамленняў фінансавай індустрыі». У межах гэтай працы з 1 студзеня 2017 года ў Беларусі будзе зроблены пераход на выкарыстанне міжнароднай структуры нумара рахунку (IBAN) і банкаўскага ідэнтыфікацыйнага кода (БІК).

Перспектывы далейшага ўкаранення міжнародных стандартаў у плацежную сістэму будуць адлюстраваны ў новай Канцэпцыі развіцця плацежнай сістэмы Беларусі на 2016—2020 гады. Гэты дакумент вызначыць сярэднетэрміновую стратэгію развіцця плацежнай сістэмы краіны з улікам прагрэсіўнага сусветнага вопыту і неабходнасці кансалідацыі намаганняў і рэсурсаў Нацыянальнага банка, банкаў і іншых кампетэнтных органаў у частцы рэалізацыі задач па далейшым павышэнні эфектыўнасці, надзейнасці і бяспекі функцыянавання інфраструктуры фінансавага рынку дзяржавы.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Залаты заклад

# КАЛІ КАШТОЎНАСЦЯЎ НЕ ШКАДА

## Што і на якіх умовах можна здаць у ламбард




**Калі верыць некаторым крыніцам, звесткі аб ламбардах дайшлі да нас яшчэ са Старажытнага Егіпта. Ведаем жа мы гэтую арганізацыю па назве італьянскага рэгіёна Ламбардыя, дзе ў XV стагоддзі засналі крэдыты пад заклад маёмасці. Сёння ламбард па сваіх функцыях нагадвае банк, які выдае пазыкі на пэўны прамежак часу, як правіла, пад заклад антыкварыяту ці каштоўных упрыгожанняў. У нашай краіне канкурэнцыя ў гэтай сферы спецыфічная, і развіццё бізнесу часта залежыць ад размяшчэння і якасці сэрвісу.**

### ПРЫВАБІЦЬ АБСЛУГОЎВАННЕМ

Па словах **дырэктара адной з сетак ламбардаў Вадзіма АНОХІНА,** у Беларусі прынцыповых адрозненняў у паслугах гэтай сферы няма. Ацэнка ўпрыгожанняў адбываецца па вазе, таму можна вылучыцца толькі больш высокім узроўнем абслугоўвання, чым у канкурэнтаў. У краіне на сёння ламбардным бізнесам, згодна з інфармацыяй адзінага дзяржаўнага рэгістра юрасоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, займаюцца амаль 100 юрыдычных асоб.

«Тая колькасць ламбардаў, якую мы сёння назіраем у Мінску, невялікая. Напрыклад, наша фірма плануе пашырацца», — паведаміў Вадзім Анохін.

Як адзначае спецыяліст, людзі пачынаюць часцей звяртацца да паслуг «пазыковай касы». На гэта ўплываюць і эканамічныя абставіны, з пагаршэннем якіх звычайна і назіраецца рост наведвання ламбардаў.

«Аднак у людзей да гэтага часу ёсць думка, што ламбард — сумніўная арганізацыя. На гэты конт існуе мноства міфаў, далёкіх ад ісціны. На самой справе ламбард — гэта своеасаблівы міні-банк. Мы гатовы даць грошы ў заклад вашых рэчаў, якія вы потым можаце без праблем выкупіць», — растлумачыў дырэктар сеткі.

Людзі часцей за ўсё здаюць залатыя вырабы, прычым некаторыя з іх могуць быць дастаткова старыя, з непаўторнай агранкай і апрацоўкай.

**Тых, хто хоча прадаць сваё золата, значна менш за тых, хто жадае яго пакінуць у заклад. Але ў апошні час расце колькасць кліентаў, якія не вяртаюцца па свае ўпрыгожанні.**

### КАМЯНІ І АЦЭНКА

Калі вы ідзяце здаваць у ламбард сваё ўпрыгожанне, то сістэма ацэнкі вырабаў для вас будзе дастаткова простая. Заклад выдаецца паводле таго, што пакажуць шалі, — ацэньваецца менавіта вага вырабу. У беларускіх ламбардах ёсць адна асаблівасць: тут не ўлічваецца цана каштоўнага каменя.

«Адной з нашых найважнейшых праблем з'яўляецца тое, што мы не можам ацэньваць камяні, таму да гэтага часу выдаем заклад па чыстай вазе золата, што на гэтым этапе людзей не заўсёды задавальняе. Натуральна, што атрымаць за выраб з брыльянтам ад 300 да 600 тысяч беларускіх рублёў нявыгадна», — дзеліцца Вадзім Анохін.

У выніку мы маем цану, якую рэгулюе і ўстанаўлівае Міністэрства фінансаў. Для ацэнкі вырабаў з камянямі існуюць эталонныя ўзоры, згодна з якімі адымаецца сума вагі каменя.

«Ніхто не забараняе прымаць у заклад камяні. Але для гэтага патрэбны людзі з гемалагічнай адукацыяй. Гемолагаў у Беларусі вельмі мала, і ўсе яны могуць знайсці больш перспектыўную працу. Таму для стварэння сістэмы ацэнкі камянёў у першую чаргу не хапае спецыялістаў», — растлумачыў сітуацыю дырэктар сеткі ламбардаў.

Дарэчы, на працягу некалькіх апошніх гадоў цэны на каштоўныя металы на сусветным рынку знаходзяцца ў вольным руху. Дынаміка цэн назіраецца, але казаць аб трэндзе падзення ўсё яшчэ нельга. Тым не менш гэта практычна не паўплывала на ламбардную сістэму ацэнкі ў Беларусі.

### ПАКІДАЮЦЬ СВАЮ ПАМЯЦЬ

Ламбард, дарэчы, можа дапамагчы пазбавіцца ад каштоўнага лому — тых ювелірных вырабаў, якія не падлягаюць аднаўленню (продаж каштоўных металаў паміж фізічнымі асобамі ў краіне забаронены). Аднак іх скупкай могуць займацца і тыя арганізацыі, якія маюць ювелірную вытворчасць. Разам з тым у гарадах, дзе знаходзяцца і скупшчыкі, і ламбарды, канкурэнцыі, па словах спецыяліста, практычна не назіраецца, таму, як паказвае практыка, тых, хто хоча прадаць сваё золата, значна менш за тых, хто жадае яго пакінуць у заклад. Але ў апошні час расце колькасць кліентаў, якія не вяртаюцца па свае ўпрыгожанні.

«На мой погляд, пры любых умовах гэта няправільная практыка. Сваю рэч трэба паспрабаваць забраць у любым выпадку. Аддаць яе дзеля пары сотняў тысяч — гэта няправільна. Часцей за ўсё ўпрыгожанні асацыююцца з канкрэтнай падзеяй або чалавекам з мінулага. Атрымаць за іх грошы ў цяжкай сітуацыі — гэта нармальная практыка, але пакідаць сваю памяць камусьці іншаму не варта», — лічыць дырэктар сеткі ламбардаў.

У выпадку, калі чалавек не вяртаецца па свой выраб, то па законе супрацоўнікі ламбарда абавязаны аддаць яго ў дзяржаўнае сховішча каштоўнасцяў, якое належыць Міністэрству фінансаў. У Беларусі ювелірныя вырабы не могуць прадавацца ламбардамі, калі ў іх адсутнічае ювелірная вытворчасць.

### НІХТО НЕ ПЫТАЕЦЦА, НАВОШТА

Сярод кліентаў ламбарда дастаткова цяжка вызначыць пэўную аўдыторыю. Яго сёння наведваюць практычна ўсе слаі насельніцтва. Як правіла, гэта людзі ад 20 да 70 гадоў, якім патрэбны грошы на досыць невялікі тэрмін.

«Калі чалавеку патрэбны грошы, ніхто яго не спытае, навошта. Самае галоўнае — каб кліент пакідаў у заклад менавіта сваё золата — не крадзенае, якое не знаходзіцца ў закладзе дзесьці яшчэ ці не купленае ў крэдыт», — растлумачыў спецыяліст.

Каб здаць сваё «хараство», неабходны ўсяго 2 паперы — дагавор мікрапазыкі, а таксама закладны квіток.

У ламбарднага бізнесу зараз ёсць пэўныя перспектывы. Гэта можна заўважыць і на прыкладзе найбліжэйшых да нас краін — Украіны, Расіі. Адзінае, чаго сёння чакаюць ўласнікі ламбарднага бізнесу, — спрашчэнне заканадаўства.

«У нашай сферы вельмі спецыфічнае заканадаўства, якое месцамі не памянялася з часоў СССР, — заўважае Вадзім Анохін. — Орган кантролю павінен быць, але хацелася б, каб ламбард не заставаўся своеасаблівым пунктам прыёму золата. У ідэале мы можам працаваць як антыкварныя крамы».

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** | | |
| Продавец | **ООО «ДОРЭЛЕКТРОМАШ», Минская обл., г. Смолевичи, ул. Торговая, 16, каб. 1** | | |
| **Предмет аукциона (объекты незавершенного законсервированного строительства реализуются одним лотом)** | | | |
| **Наименование** | **Процент готовности** | **Инвентарный номер** | **Общая площадь** |
| **АБК** | 67% | 612/U-6952 | 1432,6 кв.м |
| **Здание производственного корпуса** | 76% | 612/U-6954 | 7880,3 кв.м |
| Составные части и принадлежности | Ограждение ж/б 256,7 м | | |
| **Окрасочная** | 65% | 612/U-6955 | 699,1 кв.м |
| **Месторасположение предмета аукциона: Минская обл., г. Жодино, ул. Кузнечная, д. 22** | | | |
| **Сведения о земельном участке** | Для строительства производственной базы продавцу предоставлена доля в праве постоянного пользования (249/250) на земельный участок площадью **1,6139** га. Ограничения (обременения) прав: охранные зоны линий электропередачи (пл. 0,1752 га), магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений (пл. 0,1257 га), линий связи и радиофикации (пл. 0,0594 га) | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 2 868 000 долларов США** | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **20** (двадцати) рабочих дней после согласования проекта договора купли-продажи с ЗАО «МТБанк», в связи с наличием обременения в пользу ЗАО «МТБанк» (ипотека) | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Оплата за предмет аукциона производится резидентами РБ в белорусских рублях по курсу Нацбанка РБ на дату платежа; нерезидентами РБ в белорусских рублях, либо в иностранной валюте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа, в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорены в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **30.11.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **27.11.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** | | |

Утерянные представительством Белгосстраха по Московскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ №№ 0534126-0534142, №№ 0558611, 0558706, 0558710, 0560593 **считать недействительными.** УНП 100122726

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

### на право заключения договоров аренды земельного участка для строительства и обслуживания производственной базы в г. Смолевичи

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком, зал заседаний, 30.11.2015 г. в 15.00 |
| 3 | **Продавец и его адрес** | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот №1 – площадь 0,9000 га, кадастровый номер 624800000001002568 Смолевичский район (г. Смолевичи), Минская область |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания производственной базы |
| 7 | **Начальная стартовая цена** | Лот № 1 – 800 000 000 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть индивидуальные предприниматели, юридические лица |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | Лот № 1 – возможность подключения к водоснабжению и электроснабжению |
| 10 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней со дня подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной стартовой цены на р/с 3641000000205 ЦБУ 621 филиала № 616 АСБ «Беларусбанк», г. Жодино, код 812, УНП 600014139, ОКПУ 04064735, назначение платежа 04002. (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 12 | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком** | Каждый четверг с 9.00 до 13.00 |

**Расходы по организации и проведению аукциона: (лот № 1 – 20 365 196) и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.**

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Подлесная, д. 11, каб. № 14.**

**Окончательный срок приема заявлений – 24.11.2015 г., 17.00.**

Контактный телефон (8-01776) 5-52-65.

Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

- заявление на участие в аукционе;
- документ подтверждающий внесение суммы задатка на текущий расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели и юридические лица, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом в его участии.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

**Организатор аукционов:** Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62

**Продавец:** УП «Витебское отделение Белорусской железной дороги», г. Витебск, ул. Космонавтов, 10, тел.: (0212) 37-90-72, 37-92-97 (Витебская дистанция гражданских сооружений).

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года капитального строения с инв. №250/С-29563 площадью 613,9 кв.м, расположенного по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Октябрьская, д. 38а (склад грузовой прирельсовый) для размещения складских помещений. Размер ежемесячной арендной платы 460,43 базовой арендной величины. **Начальная цена:** 18 417 000 белорусских рублей. **Размер задатка:** 1 841 000 белорусских рублей.

Лот №2. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года нежилых помещений площадью 153,6 кв.м, расположенных в капитальном строении с инв. №200/С-73230 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Мясникова, д. 4Б/5 (материальный склад НГЧ-6 с рампой) для размещения складских помещений. Размер ежемесячной арендной платы 138,24 базовой арендной величины. **Начальная цена:** 4 608 000 белорусских рублей. **Размер задатка:** 460 000 белорусских рублей.

Лот №3. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года нежилых помещений площадью 99,4 кв.м, расположенных в капитальном строении с инв. №200/С-73228 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Мясникова, д.4Б/3 (здание склада мастеров НГЧ-6) для размещения складских помещений. Размер ежемесячной арендной платы 89,46 базовой арендной величины. **Начальная цена:** 2 982 000 белорусских рублей. **Размер задатка:** 298 000 белорусских рублей.

Дата, время и место проведения аукциона: **30.11.2015 в 15.00 г. Витебск, проезд Гоголя, 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Срок внесения задатков и подачи документов: **с 27.10.2015 с 8.30 по 27.11.2015 до 17.30.**

**Продавец:** УП «Витебское отделение Белорусской железной дороги», г. Витебск, ул. Космонавтов, 10, тел. (0212)37-89-40 (отдел материально-технического снабжения).

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года капитального строения с инв. №200/С-50117 площадью 113,71 кв.м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Карла Маркса, д. 42а (склад №3а). Размер ежемесячной арендной платы 81,87 базовой арендной величины. Целевое использование: складское помещение (для хранения ТМЦ, кроме пожаро-взрывоопасных, ядовитых, а также требующих специальных условий и требований для хранения). **Начальная цена:** 3 411 300 белорусских рублей. **Размер задатка:** 341 000 белорусских рублей.

Дата, время и место проведения аукциона: **30.11.2015 в 11.00 г. Витебск, проезд Гоголя, 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Срок внесения задатков и подачи документов: **с 27.10.2015 с 8.30 по 27.11.2015 до 17.30.**

**Продавец:** УП «Витебское отделение Белорусской железной дороги», г. Витебск, ул. Космонавтов, 10, тел. (0212)37-96-10 (Витебская база (транспортная)).

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года нежилых помещений площадью 178,7 кв.м, расположенных на 1-м и 2-м этажах капитального строения с инв. №200/С-50738 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Революционная, д. 7 (контора и гаражи автобазы) для оказания услуг связи, туристических услуг, услуг торговли, услуг банков, услуг по страхованию, услуг, связанных с операциями с недвижимым имуществом, услуг по работе на вычислительной технике и связанного с этим обслуживания, услуг в области рекламы, под офис. Размер ежемесячной арендной платы: 160,83 базовой арендной величины. **Начальная цена:** 5 361 000 белорусских рублей. **Размер задатка:** 536 000 белорусских рублей.

Дата, время и место проведения аукциона: **01.12.2015 в 11.00 г. Витебск, проезд Гоголя, 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Срок внесения задатков и подачи документов: **с 27.10.2015 с 8.30 по 30.11.2015 до 17.30.**

**Продавец:** УП «Витебское отделение Белорусской железной дороги», г. Витебск, ул. Космонавтов, 10, тел. (0212)37-89-72 (вокзал станции Витебск).

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года: нежилых помещений площадью 276,7 кв.м, расположенных на 2-м этаже капитального строения с инв. №200/С-41815 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Космонавтов, 10Г (административное здание); части нежилого помещения площадью 10,44 кв.м, расположенного на 1-м этаже капитального строения с инвентарным №200/С-56147 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Космонавтов, 8 (здание железнодорожного вокзала). Размер ежемесячной арендной платы 137,83 базовой арендной величины. Целевое использование: для производства пищевой продукции и организации общественного питания. **Начальная цена:** 8 614 200 белорусских рублей. **Размер задатка:** 861 000 белорусских рублей. Условие аукциона: заключение договора аренды торгового павильона и оборудования, расположенного на арендуемых площадях, после получения согласия собственника на сдачу в аренду данного имущества.

Дата, время и место проведения аукциона: **01.12.2015 в 09.00 г. Витебск, проезд Гоголя, 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Срок внесения задатков и подачи документов: **с 27.10.2015 с 8.30 по 30.11.2015 до 17.30.**

**Продавец:** УП «Витебское отделение Белорусской железной дороги», г. Витебск, ул. Космонавтов, 10, тел. (0214) 45-62-12 (Локомотивное депо Полоцк).

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года нежилого помещения площадью 65,7 кв.м, расположенного в капитальном строении с инв.№250/С-27224 по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, д. 58а (склад с рампой) для размещения складских помещений. Размер ежемесячной арендной платы: 29,565 базовой арендной величины. **Начальная цена:** 1 971 000 белорусских рублей. **Размер задатка:** 197 000 белорусских рублей.

Дата, время и место проведения аукциона: **27.11.2015 в 15.00 г. Полоцк, ул. Ленинградская, 64А в Локомотивном депо Полоцк.** Срок внесения задатков и подачи документов: **с 27.10.2015 с 8.30 по 26.11.2015 до 17.30.**

**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукционы проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы, предоставить: копию платежного документа о перечислении задатка на р/с организатора аукциона; юр. лицом – резидентом РБ: копию документа, подтверждающую гос. регистрацию юр. лица; юр. лицом – нерезидентом РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем: копию документа, подтверждающего гос. регистрацию индивидуального предпринимателя. При подаче заявления на участие в аукционе предъявляется документ, удостоверяющий личность; представителями – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). Победитель аукциона – лицо, предложившее самую высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях, если Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также в случае, если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: №3012078870010 ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», БИК 153001117, г. Витебск, ул. Ленина, 17, УНП 390477566. **Контактный тел.: (0212) 42-61-62, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

### Аукцион состоится 30 ноября 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67

*Аукционные торги проводятся в соответствии с Инструкцией о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов недвижимости и иного имущества, не относящегося к государственной собственности, а также аукционов на право заключения договоров аренды нежилых помещений, утвержденной приказом №5а от 22.01.2014 г.*

| № лота | Наименование предмета торгов; местонахождение имущества, условия оплаты | Краткая характеристика предмета торгов | Начальная цена, белорусских рублей (с НДС) | Задаток, белорусских рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Технологическое оборудование для изготовления конструкций из ПВХ в количестве 14 единиц<br>Местонахождение имущества: **Гомельская обл., г. Гомель, ул. Владимирова, 10**<br>Условия оплаты: **Возможна рассрочка платежа до 6 месяцев** | Перечень оборудования:<br>1. станок для обработки торцов импоста мод. KM212;<br>2. станок прямолинейной обработки кромки стекла мод. SE10M;<br>3. станок для фрезерования водоотливных канавок мод. ST263;<br>4. станок экономичный углозачистной мод. CA601;<br>5. копировально-фрезерный станок мод. FR224;<br>6. машина горячего прессования для стеклопакетов мод. RP-1500;<br>7. машина мойки и сушки стекла мод. TRW-1500;<br>8. одноголовочная ПВХ-сварочная машина мод. TK501;<br>9. пила для резки штапика;<br>10. пила с изменяемым углом резки 350 мм мод. KD350 (пневм.);<br>11. стенд для нанесения герм. ленты мод. TRT-1300;<br>12. установка для заполнения газом мод. TRG-2;<br>13. установка компрессорная мод. СБ4/Ф-270LB75;<br>14. экструдер бутила (хот-мелта) | 486 000 000 | 25 000 000 |

Продавец: **Открытое акционерное общество «Гомельский завод «Коммунальник», 246034, г. Гомель, ул. Владимирова, 10.**

Организатор торгов: **Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Региональное инвестиционное агентство «ГомельИнвест», г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67, тел. (0232) 25 49 00, факс (0232) 25 49 01.**

*Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на р/с 3012113129041 в Региональной Дирекции №300 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369. Получатель платежа – ГП «РИА «ГомельИнвест», УНП 490779270. Назначение платежа: «Задаток для участия в аукционе 30 ноября 2015 г.»*

К участию в аукционе допускаются физические и юридические лица, индивидуальные предприниматели, (резиденты и нерезиденты Республики Беларусь), подписавшие соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и подавшие своевременно следующие документы:

- заявление на участие в аукционе;
- платежное поручение (или иной платежный документ) о внесении задатка;

юридическими лицами (резидентами Республики Беларусь):

- доверенность представителя юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);
- копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

представители физических лиц (резидентов Республики Беларусь):

- нотариально заверенную доверенность;

*индивидуальным предпринимателям* – копия свидетельства о государственной регистрации;

*юридическими лицами (нерезидентами Республики Беларусь):*

- легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;
- документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

*представители юридических и физических лиц (нерезиденты Республики Беларусь)* – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Документы для участия принимаются по адресу: г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67 по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 по 26.11.2015 г. включительно.**

Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, подавшие в установленный срок заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявленному лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию **с 10.00 до 11.00 30 ноября 2015 г.**

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов.

Победитель торгов (единственный участник, выразивший согласие купить предмет торгов) обязан:

- подписать протокол о результатах аукциона;
- в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения торгов возместить Организатору вознаграждение, включая фактические затраты, связанные с организацией и проведением аукциона. Размер вознаграждения составляет 4% от начальной цены проданного с аукциона объекта и 5% от суммы превышения цены продажи объекта над начальной ценой, но не менее суммы фактических расходов;
- в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов;
- в сроки, согласно заключенному договору купли-продажи, выплатить Продавцу стоимость предмета торгов, сформированную в установленном порядке.

Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона (единственным участником, не пожелавшим купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5%), возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Задаток участника аукциона, ставшим Победителем (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов), засчитывается в счет окончательной стоимости предмета торгов.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (единственным участником) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет десять базовых величин за каждый случай нарушения.

Продавец вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

**Справки по тел. (029) 679 02 81.**

КАРАНІ І КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя №5



■ Прыродныя катаклізмы

# КАЛІ АБМЯЛЕЛІ РЭКІ...

## ЦІ ПАГРАЖАЕ НАШАЙ ЗЯМЛІ ВОДНЫ АПАКАЛІПСІС?




Фота БЕЛТА.

**На думку экспертаў, лета 2015-га выдалася адным з самых рэкордных і супярэчлівых у гідраметэаралогіі. З аднаго боку, спякота — тэмпературныя рэкорды адзначаліся ў Еўропе, на Блізкім і Сярэднім Усходзе, у некаторых штатах ЗША. З іншага — моцныя дажджы ў Аргенціне, ЗША, Японіі, Грузіі, Францыі. Амерыканскія навукоўцы спрагназавалі далейшае павышэнне ўзроўню Сусветнага акіяна, з прычыны чаго ў найбліжэйшыя дзесяцігоддзі будуць затоплены некаторыя ўчасткі планеты.**
**Усе тры летнія месяцы сярэдняя тэмпература была вышэйшая за норму і ў Беларусі, а ў жніўні абсалютныя значэнні яе дасягнулі рэкордных + 36,7 °С. Можа, нам пагражае засуха або іншыя катаклізмы? І як паўплывае на Сінявокую магчымае павышэнне ўзроўню Сусветнага акіяна?**

Спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя бягучы гідралагічны год называюць маламодным, а агульны рачны сцёк можа аказацца найменшым за ўвесь перыяд назіранняў. У некаторых рэках ад Паазер'я да Палесся ўзровень вады ў летні перыяд быў ніжэйшы або вельмі наблізіўся да гістарычнага мінімуму.

Па словах **начальніка аддзела гідралагічных прагнозаў Гідрамета Марыны НАГІБІНАЙ,** складанае гідралагічнае становішча ў гэтым годзе тлумачыцца папярэднімі гідраметэаралагічнымі ўмовамі на тэрыторыі басейнаў рэк. Істотны ўплыў аказала развіццё нізкіх вясновых паводак два гады запар, ад якіх рэкі не станавіліся паўнаводнымі, як звычайна. Так, у мінулым годзе паверхневыя водныя рэсурсы на тэрыторыі Беларусі склалі ўсяго 40,9 км³ пры норме 57,9 км³, або 71% ад сярэдняй шматгадовай велічыні. У мнагаводныя гады агульны рачны сцёк павялічваецца да 92,4 км³, у маловодныя — зніжаецца да 29,8 км³ у год.

### Хто вінаваты: чалавек ці прырода?

У сваю чаргу **начальнік аддзела гідралогіі і дзяржаўнага воднага кадастру Гідрамета Людміла ЖУРАВОВІЧ** адзначае: «Нягледзячы на тое, што апошнія два гады ўзроўні вады летне-асенняй межані былі самымі нізкімі, сур'ёзнага апасення пагаршэння сітуацыі пакуль няма». Яна прывяла прыклад ракі Днепр на ўчастку ў Рэчыцы: малая колькасць вады там назіралася ў 20-я гады мінулага стагоддзя, а таксама ў 1972-м і 1992-м гадах. Але пасля спадаў заўсёды наступаў уздым, ішло напаўненне рэк за кошт ападкаў, і ўзровень вады аднаўляўся.

— У гэтым годзе проста супалі некалькі негатыўных фактараў, — гаворыць спецыяліст. — Малая воднасць папярэдняга года, нізкая вясновая паводка бягучага, невялікая колькасць ападкаў, павышаны тэмпературны рэжым — усё гэта спрыяла памяншэнню ўзроўню вады ў рэках.

Калі тэндэнцыя працягнецца і ў наступным годзе, то ўзроўні летне-асенняй межані могуць быць яшчэ ніжэйшыя, а ў Беларусі часцей стануць узнікаць засухі. Гэтым летам перасох Жыткавіцкі канал, які сілкуе палескае возера Чырвонае. Вада адновіць свой баланс, калі восень будзе дажджлівай, а ўзімку выпадзе дастаткова снегу.

Ці ўплывае чалавечая дзейнасць на гэты працэс? Па словах **дэкана факультэта інжынерных сістэм і экалогіі Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта, доктара геаграфічных навук, прафесара Аляксандра ВОЎЧАКА,** гідралагічная сітуацыя, у асноўным, вызначаецца прыродна-кліматычнымі фактарамі, а любыя прыродныя працэсы маюць цыклічны характар развіцця. Вядома, сучасныя антрапагенныя ўздзеянні ўзрастаюць і, несумненна, узмацняюць негатыўныя наступствы памяншэння сцёку. Але іх доля ўвогуле не перавышае 10% ад усіх фактараў. Таму экасістэма знаходзіцца ва ўстойлівым стане і можна чакаць, што на змену маламодным гадам прыйдуць мнагаводныя.



**У Віцебску ўзровень вады ў Заходняй Дзвіне апусціўся на 4 см ніжэй за гістарычны мінімум.**

### Без вады — і ні туды і ні сюды

Гідралагічнае становішча ў басейнах рэк у бягучым годзе спрыяла пагаршэнню экалагічнага стану (заморы рыбы, «цвіценне» вадаёмаў) і гаспадарчай дзейнасці, а таксама абмежаванню перасоўвання рачнога транспарту на суднаходных участках.

Вясна і лета сталі сур'ёзным выпрабаваннем і для сельскай гаспадаркі краіны. Па словах **начальніка аддзела аграметэаралагічных прагнозаў Гідрамета Надзеі МЕЛЬЧАКОВАЙ,** праблемы пачаліся яшчэ мінулай восенню. У паўднёва-ўсходнім рэгіёне Беларусі за ўвесь восеньскі сезон ападкаў выпала не больш за 15-30% ад кліматычнай нормы. У выніку гэтай засухі не атрымаў нармальнага развіцця азімы рапс і ўжо першыя халады аказаліся для яго згубнымі.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

■ Місія — выратаванне

# ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ БАЛОТА

**Пры падтрымцы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Праграмы развіцця ААН і Глабальнага экалагічнага фонду ў Беларусі, унітарнага прадпрыемства «Кока-Кола Беўрыджыз Беларусія» распачата праца па аднаўленні гідралагічнага рэжыму на Ельні. Пятае па велічыні ў Еўропе верхавое балота мае няпросты лёс. Падчас вялікіх пажараў у 1998 і 2002 гадах згарэла амаль палова яго тэрыторыі.**



Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.



У 30-я гады мінулага стагоддзя для сельскагаспадарчых патрэб на Ельні былі зроблены водаадводныя каналы. Праз некалькі дзесяцігоддзяў канструкцыі сталі непатрэбнымі. Аднак умяшанне чалавека ў экасістэму парушыла гідралагічны баланс балота. Узровень вады панізіўся, што прывяло да перасыхання верхняга ўзроўню торфу. Вядома, што сухі торф — сапраўдная «прыродная ўзрыўчатка». Для вялікага пажару дастаткова аднаго недакурка. Торф гарыць да апошняга, пакуль не будзе цалкам заліты вадой. Пажары 1998 і 2002 гадоў паказалі, што калі не заняцца аднаўленнем парушанага балота, трагедыя можа мець працяг. Дарэчы, сёлета Ельня зноў загаралася: пажар ахапіў 20 га тэрыторыі.

Першыя дамбы з'явіліся на балоце ў 2007 годзе. Тады пры фінансавай падтрымцы «Кока-Кола Беўрыджыз Беларусія» валанцёры грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» пабудавалі 34 плаціны і перамычкі на водаадводных каналах. Канструкцыі рабіліся з абгарэлых дрэў і торфу. Потым колькасць плацін павялічылася яшчэ на 20. Праводзілася мадэрнізацыя ўжо існуючых пабудоў. Праз некалькі гадоў драўніна і торф пачалі здаваць пазіцыі: гэтыя матэрыялы зношваюцца.

Цяпер спецыялісты вырашылі скарыстацца новым тэхналагічным прыёмам: яны будуюць даўгавечныя плаціны, зробленыя з палімерных шпунтоў з ПВХ. Тэхналогіі паспяхова прымяняліся пры аднаўленні гідралагічнага рэжыму балот Ірландыі і Шатландыі. Праца вядзецца ў рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі Праграмы развіцця ААН і Глабальнага экалагічнага фонду «Тарфянішчы-2». Плануецца пабудаваць каскад перамычак на асноўных вадатоках, якія ўпадаюць у балота.

— Даследаванні паказалі, што палімерны шпунт з ПВХ — даўгавечны матэрыял: ён можа праслужыць прыкладна 84 гады. Да таго ж ён экалагічны, бо нічога не забірае з асяроддзя і нічога не пакідае ў ім, — распавёў **намеснік дырэктара прадпрыемства «ЭлектраМакс» Дзмітрый АНТАНОВІЧ.**

(Заканчэнне на 8-й стар.)

## Экалагічны лікбез

**У нашай краіне створаны ўсе ўмовы для аматараў бавіць свой вольны час з вудай або стрэльбай у руках. Гаворка і пра наяўнасць лясных і рыбалоўных угоддзяў, і пра разнастайнасць відаў паляўнічых жывёл, птушак, рыб у вадаёмах. Нават калі які-небудзь від палявання, напрыклад, некаму падасца дарагаватым, заўсёды можна знайсці тое, што будзе па кішэні. Галоўнае, каб памкненні паляўнічых ці рыбаловаў здабыць жаданы трафей былі строга ў рамках заканадаўства. Бо, на жаль, здараюцца выпадкі, калі сваімі непрадуманымі (а часам нават першапачаткова карыслівымі) дзеяннямі грамадзяне наносяць прыродзе шкоду. Для адных такіх парушальнікаў справа абмяжоўваецца адміністрацыйнай адказнасцю, іншым жа даводзіцца адказваць за свае ўчынкі згодна з Крымінальным кодэксам...**

## ПАДСТРЭЛІЎ ПТУШКУ ГОДА

**У Вілейскім раёне па падазрэнні ў нелегальным промысле была затрымана група паляўнічых-мінчан. Мужчыны вярталіся з палявання на вадаплаўную дзічыну, калі іх аўтамабіль спынілі супрацоўнікі Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. У салоне яны знайшлі тушку падстрэленай птушкі, аднак не вадаплаўнай, а савы.**

— Кіроўца патлумачыў, што трапіў у яе, прыняўшы за качку. Відавочна, страляў па невыразна бачнай цэлі, што ўжо з'яўляецца парушэннем. За рэдкую птушку са спіса CITES, абвешчаную ў Беларусі птушкай года, грамадзяніну давядзецца выплаціць 31,5 мільёна рублёў, — паведаміла **прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга ГРАМОВІЧ**.

У дзеяннях паляўнічых былі і прыкметы іншых парушэнняў. Апроч сваёй зброі, яны перавозілі ў машыне стрэльбу, што належала старонняй асобе. Большасць знойдзеных у іх патронаў была з карцеччу і кулямі, хаця пры паляванні на птушыную дзічыну дазволены выключна шрот. Яшчэ большыя падазрэнні выклікаў знешні выгляд аднаго з затрыманых: на руках мужчыны былі бурыя плямы, падобныя на кроў, а на адзенні — поўсць.

У працэсе разбору да месца спынення аўтамабіля наблізілася яшчэ адна машына. Але, як толькі дзяржінспектары накіраваліся ў яе бок, кіроўца зрабіў рэзкі паварот і з'ехаў. Абставіны справы расследуе Вілейскі РАУС. Вырашаецца пытанне аб завядзенні дзвюх крымінальных спраў за незаконнае паляванне па артыкуле 282 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

## АДКУЛЬ У РЫБАКА КРЫЖАНКА?

**У пойме ракі Стыр у паляўнічых угоддзях Пінскай раённай структуры таварыства паляўнічых і рыбаловаў увагу супрацоўнікаў Пінскай міжраённай інспекцыі прыцягнуў мясцовы жыхар. У яго руках былі загінулы качар крыжанкі і... спінінг.**

Затрыманы сцвярджаў, што знайшоў птушку без прыкмет жыцця ў чароце і нёс яе дадому. Аднак у дачыненні да мужчыны быў складзены адміністрацыйны пратакол па частцы 2 артыкула 15.37 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, і цяпер яму пагражае даволі вялікі штраф. За сваю «нядзелю» знаходку і яе перамяшчэнне без дакументаў, што пацвярджалі б права валодання паляўнічай птушкай, правапарушальніку давядзецца заплаціць ад 20 да 50 базавых велічынь (ад 3,6 да 9 мільёнаў рублёў).

**ДА ВЕДАМА.** У адпаведнасці з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, забараняюцца перамяшчэнне (транспарціроўка) і разбор дзікіх жывёл, у тым ліку загінулых (ці іх частак), без дакументаў, прадугледжаных актамі заканадаўства.

## ЗНЯЛІ «НАПРУЖАННЕ» ПРАБЛЕМЫ

**На працягу першага года з моманту ўтварэння Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь колькасць выпадкаў браканьерства з дапамогай электратоку дасягала 50. Вынікам правядзення пастаянных кантрольных мерапрыемстваў і прымянення жорсткіх мер пакарання да такіх парушальнікаў стала істотнае змяншэнне такіх фактаў, а пачынаючы з 2011 года колькасць выпадкаў лоўлі рыбы з выкарыстаннем электралавільных прыстасаванняў стабільна скарачаецца.**

Маштабы і наступствы рыбалкі электравудай непапраўныя для кожнага вадаёма, бо знішчаецца не толькі рыба, але і ўсе жывыя арганізмы. Пры гэтым асноўная частка трапіўшай пад ток рыбы ідзе на дно і гіне. Нешматлікія выжыўшыя рыбы губляюць магчымасць да рэпрадукцыі.

— Разам з тым і цяпер маюць месца выпадкі такога браканьерства. Цягам гэтага года Дзяржаўнай інспекцыяй выяўлена пяць выпадкаў электралоўлі. Так, інспектары Кармянскай міжраённай інспекцыі сумесна з супрацоўнікамі міліцыі паблізу адселенай вёскі Залатоміна затрымалі траіх грамадзян. Мужчыны перавозілі незаконна здабытую рыбу — 220 асобін розных відаў, якую вылавілі з дапамогай электралавільнага прыстасавання на рацэ Касалянка. Затрыманыя мелі пры сабе дзве акумулятарныя батарэі, узмацняльнік току, сачок, правады, гумавую лодку. Шкода, нанесеная ў выніку незаконных дзеянняў браканьераў, склала амаль 322 мільёны рублёў. Заведзена крымінальная справа па частцы 4 артыкула 281 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (незаконная здабыча рыбы, якая пацягнула нанясенне шкоды ў асабліва буйным памеры).

Судом Кармянскага раёна кожны парушальнік прыгавораны да пазбаўлення волі тэрмінам на адзін год (з адтэрміноўкай выканання пакарання на два гады), 100 гадзін папраўчых работ, штрафу ў памеры 18 мільёнаў рублёў і кампенсацыі нанесенай шкоды ў салідарным парадку.

Сяргей РАСОЛЬКА. rs@zviazda.by

# КАЛІ АБМЯЛЕЛІ РЭКІ...



Фота БЕЛТА.

Паводка на рацэ Сож (красавік 2013 г.).

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

З прычыны восеньскага дэфіцыту ападкаў і маласнежнай зімы ў пачатку сельскагаспадарчай вясны запасы вільгаці на большасці плошчаў былі меншымі за сярэдні шматгадовыя паказчыкі. Таму вільгацезабяспечанасць і спрыяльная вегетацыя раслін залежалі ад ападкаў у вясенне-летні перыяд. **Спецыялісты адзначаюць, што такіх сухіх чэрвеня і жніўня не было ні разу за 70 гадоў метэаралагічных назіранняў: сёлета за першы летні месяц у сярэднім па краіне ападкаў выпала каля 30% ад кліматычнай нормы, а ў жніўні — менш за 15% ад нормы.**

Найбольш істотна пацярпеў паўднёва-заходні рэгіён рэспублікі. На Гомельшчыне, дзе пераважаюць больш лёгкія глебы, засуха пачалася яшчэ ў маі і аказалася самай інтэнсіўнай. Пашкоджанні збожжавых культур адзначаліся і ў іншых рэгіёнах, у тым ліку ў Магілёўскай вобласці, на ўсходзе і паўднёвым усходзе Міншчыны. На захадзе і поўначы краіны глебавая засуха ў першай палове лета была не такая істотная. У гаспадарках, дзе падтрымліваўся неабходны ўзровень агратэхнікі, атрымалі даволі высокі ўраджай збожжа.

### Выпрабаванне «вялікай вадой»

У Беларусь перыядычна прыходзіць і «вялікая вада». «Адзнакі паверхні Беларусі ў асноўным перавышаюць 100 м у балтыйскай сістэме вышынь, таму пытанні затаплення з прычыны павелічэння ўзроўню Сусветнага акіяна для нашай краіны пакуль не занадта актуальныя», — распавёў Аляксандр Волчак.

Як адзначыў прафесар, Беларусь — раўнінная краіна. Палеская нізіна з'яўляецца дном былога «Мора Герадота», і ўсе праблемы, звязаныя з паводкай, адбываліся ў выніку раставання снегу вясной (вясновыя паводкі), багатых працяглых дажджоў (дажджавыя паводкі) або іх сумеснага ўздзеяння.

Глабальных пераменаў у гідралагічнай сетцы Беларусі чакаць не варта, як сцвярджае вучоны. Адбываюцца лакальныя змены плыні асобных рачулак, выкліканыя прыроднымі фактарамі або антрапагеннымі ўздзеяннямі.

Да таго ж, **паводкі і разводдзе — неабходная фаза воднага рэжыму кожнай ракі, гэтыя працэсы не могуць уяўляць небяспеку для прыродных экасістэм, наадварот — іх адсутнасць прыгнятальна дзейнічае на навакольны свет.** Падчас паводак затапляюцца ў асноўным поймення ўчасткі рэк, на якіх пасля сходу вады застаюцца глей і іншыя дновыя адклады, якія спрыяюць угнаенню глебы.

Самая вялікая паводка ў нашай краіне адбылася ў 1845-м (такая ўнікальная з'ява можа здарыцца з верагоднасцю 1 раз у 800 гадоў). Максімальны выдатак на рацэ Прыпяць у створы Мазыра тады склаў прыблізна 11 000 $м^3/с$ (інструментальных назіранняў тады не праводзілася). А падчас паводкі 1895 года гідролагі зафіксавалі гэты паказчык на ўзроўні 5670 $м^3/с$.

Па словах Аляксандра Воўчака, паводкі на Палессі здараюцца цыклічна — раз у 11 гадоў (цыкл сонечнай актыўнасці). Так, найбольш значныя за апошнія дзесяцігоддзі адзначаліся ў Беларусі ў 1999 і 2010 гадах.

— Наогул, любыя прыродныя анамаліі не з'яўляюцца бедствам для прыродных экасістэм, — адзначае спецыяліст. — Яны з часам аднаўляюцца, найцяжэй людзям. Аднак падкрэслю, што адбываецца гэта праз тое, што чалавек не лічыцца з законамі прыроды. Прыкладаў таму шмат: актыўнае засваенне поймаў шляхам іх забудовы, загараджальных дамбы, будаўніцтва мастоў і дарог без уліку спецыфікі гідралагічнага рэжыму поймаў рэк, масавае выраўноўванне рэк, буйнамаштабная меліярацыя і г.д.

### Якія прагнозы?

Па словах Марыны Нагібінай, змены гідралагічнай сітуацыі да канца 2015 года чакаць не варта — сур'ёзных цыклонаў не прадбачыцца. Якім будзе наступны год, пакуль прадказаць складана.

Але, нягледзячы на верагоднасць паўтарэння «сухога» сцэнарыя ў 2016-м, спецыялісты глядзяць у будучыню з аптымізмам: доўгачаканыя дажджы могуць прыйсці ў Беларусь, каб насыціць вільгацю зямлю і зрабіць рэкі зноў паўнаводнымі.

Вераніка КОЛАСАВА. kolasava@zviazda.by

# ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ БАЛОТА

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Невялікая плаціна з гэтага матэрыялу ўжо тры гады выдатна дзейнічае на балоце Барцяніха. Усяго плануецца паставіць дзве такія плаціны на Ельні. Дадаткова будуць пабудаваны 48 перамычак з торфу.

Будаўніцтва новых плацін можна лічыць новым этапам у аднаўленні Ельні: да працы актыўна падключыліся не толькі зацікаўленыя асобы, але і навукоўцы, якія падказваюць, як правільна праводзіць аднаўленне гідралагічнага рэжыму на балоце.

— Узвядзенне плаціны — гэта маштабны праект, — адзначае **дырэктар рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Ельня» Іван БАРОК**. — У першую чаргу яно патрэбна для прадухілення пажараў.

Дарэчы, канструкцыі даюць станоўчы эфект: за восем гадоў узровень вады на балоце падняўся на адзін метр. Пачаў аднаўляцца сфагнум і журавіннік.

— Праз пажар мы страцілі больш за палову журавінавых запасаў, цяпер 7 тысяч га павінны аднавіцца, — распавядае **тэхнічны каардынатар праекта Мікалай ЧЭРКАС**. — Проста каб патлумачыць, што азначаюць журавіны для мясцовага насельніцтва, прывяду лічбы. Сем гадоў таму яго заробак на ягадах за сезон ацэньваўся ў 1 мільён долараў. Цяпер гэтая лічба вырасла да 5 млн долараў.

Ельня каштоўная не толькі ягадамі. Гэта стаянка для многіх відаў водна-балотных птушак, «міжнародны аэрапорт» для гусей і жураваў. Тут гняздуюцца чырванакніжнікі: толькі на Ельні налічваецца каля 40% папуляцыі белай курапаткі. Экасістэма мае вялікія запасы вады: яна захоўвае столькі вадкасці, колькі ў Нарачы альбо ў двух вілейскіх вадасховішчах.

Нягледзячы на той факт, што Беларусь лічыцца сусветным лідарам па аднаўленні балот, працы яшчэ хапае.

Кацярына РАДЗЮК. radziuk@zviazda.by



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Усё, што вы хацелі ведаць пра...

# Прэснаводную рыбу нашых вадаёмаў

**Беларусь уваходзіць у лік найбуйнейшых еўрапейскіх вытворцаў прэснаводнай рыбы і практычна не ўступае па аб'ёмах такім краінам, як Венгрыя альбо Чэхія. Зараз у рыбгасах праводзіцца адлоў рыбы новага сезона. Па прагнозах кіраўніка аддзела сажалкавага рыбаводства дзяржаўнага аб'яднання «Белводгас» Віталя ПАНАМАРЭНКІ, гаспадаркі выйдуць на лічбу 9,6 тысячы тон — мінулагодні паказчык, і гэта нягледзячы на засуху, з прычыны якой абмялелі многія вадаёмы краіны. У асноўным беларуская таварная рыба адпраўляецца на экспарт у Расію (пераважна ў Санкт-Пецярбург і Маскву), рыбапасадачны матэрыял — у Літву.**



## ПРЫЦЭЛ НА «ЭЛІТУ»

Пік вырошчвання прыпаў на 2012 год, калі адлавілі 16,1 тысячы тон рыбы. Калі параўноўваць, то, напрыклад, у 1999 годзе агулам было вырашчана 5 тысяч тон прамысловай рыбы. На думку Віталя Панамарэнкі, дасягнуць такіх паказчыкаў стала рэальна дзякуючы рэалізацыі Рэспубліканскай праграмы развіцця рыбнай галіны, разлічанай на 2006—2010 гады. Яна прадугледжвала маштабную рэканструкцыю сажалак, інкубацыйных гадавальнікаў. Таксама ў яе былі закладзены мерапрыемствы па мадэрнізацыі цэхаў па перапрацоўцы прэснаводнай рыбы. А вось Дзяржаўная праграма развіцця рыбных гаспадарак, разлічаная на перыяд з 2011-га па 2015 год, не была забяспечана фінансава.

Самай папулярнай рыбай, якая вырошчваецца ў беларускіх рыбгасах, з'яўляецца карп — яго доля складае да 75%. Чаму так? Карп мае самы вялікі патэнцыял росту: з 1 га можна атрымаць да 3 тон рыбы. Для параўнання: белага амура і таўсталобіка магчыма вырасціць па 500-600 кілаграмаў з 1 га плошчы, сома альбо шчупака — усяго 50 кілаграмаў з га. У сярэднім рыбгасы выходзяць на гэтую лічбу.

Карп — папулярны від у Славакіі, Польшчы, Венгрыі. Прыкладна 3 мільёны тон карпа штогод вырошчваюць у Кітаі, дзе яго празвалі «рыбай шчасця». Карп харчуецца камбікормам. Наступныя па папулярнасці раслінаедныя рыбы — стракаты і белы таўсталобік і белы амур. Затым ідзе карась, апошнія ў спісе — шчупак і сом.

Лічыцца, што сажалкавае рыбаводства ў нас ужо развіта. Цяпер стараюцца фінансаваць развядзенне каштоўных відаў рыб — стронгі, сёмгі, сцерлядзі.

— Што датычыцца элітных відаў рыб (стронга радужная, некаторыя асятровыя), то ў Беларусі за год вырошчваецца прыкладна 500 тон таварнай прадукцыі. Зараз распрацоўваецца новая праграма, якая дазволіць вырошчваць да 2000 тон рыбы. Летась у краіне была наладжана вытворчасць ікры сцерлядзі. Агулам атрымліваецца каля 400 кілаграмаў у год, — распавёў **кіраўнік аддзела рыбалоўнай гаспадаркі і індустрыяльнага рыбаводства прадпрыемства «Белводгас» Андрэй СЯРГЕЕЎ.**

## РЫБЫ БОЛЬШ, АЛЕ ЦІ ДОБРА ГЭТА?

Усяго ў беларускіх вадаёмах водзіцца 65 відаў рыб, 9 з іх — чырванакніжнікі: сцерлядзь, кумжа, ласось, стронга ручаёвая, ліпень, мірон, рыбец, стынка, азёрны гальян. Але з'яўляюцца і новыя, чужародныя віды: іх усяго 18, напрыклад колюшка малая паўднёвая ці іголка-рыба чарнаморская пухлашчокая. Чужародныя альбо інвазійныя рыбы шкодзяць нашым абарыгенным відам.

— Па-першае, з прамысловымі мэтамі яны не вылаўліваюцца — надта маленькія. Рыбаловы-аматары таксама не жадаюць браць такую драбязу. А чужынцы, у сваю чаргу, з'ядаюць частку харчу, а часам і ікру нашых рыб. Самі яны добра нерасцяцца, — адзначае **загадчык лабараторыі іхтыялогіі Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах Віктар РЫЗЕЎСКІ.**

Але не толькі «госці» перашкаджаюць абарыгеннай рыбе. На думку спецыяліста, прэсінг рыбаловаў-аматараў стаў проста невыносны, яны не даюць развівацца шчупаку, галаўлю, язю. Пабудова плацін на рэках таксама дае пра сябе знаць. Напрыклад, вусач жыве ў рэках, дзе вада бурліць. Калі ў такіх мясцінах ставяць плаціны, то на рацэ ствараюцца іншыя ўмовы. Вусач там больш вадзіцца не будзе. Змена клімату на карысць цеплалюбівых відаў рыб: карпа, карася. Халаднаводныя (большасць з якіх — чырванакніжнікі) стронга, кумжа, сёмга не змогуць выжыць у такіх умовах. Затое добра размнажаюцца небяспечныя для нашых рыб інвазійныя віды.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## КРЫНІЦА ВІТАМІНАЎ

Існуе меркаванне, што нашы людзі аддаюць перавагу не айчыннай, а прывезенай марской рыбе. Сажалкавая рыба змяшчае ў сабе ўсе неабходныя амінакіслоты і вітаміны, толькі ў меншай колькасці ў параўнанні з марской. Арганізм беларусаў генетычна больш адаптаваны да спажывання прэснаводнай рыбы. Увогуле, свежая рыба павінна быць абавязковым кампанентам у меню, бо яна багатая на неабходныя для арганізма амега-3 і амега-6 тлустыя кіслоты.

У любым выпадку, прэснаводная рыба больш карысная, чым мяса. Яна змяшчае шмат нізкакаларыйнага бялку. Таўсталобік па харчовых якасцях пераўзыходзіць мінтай, хека, гарбушу. Уся рыба ў нашых вадаёмах чыстая, праходзіць радыяцыйную праверку.

Як адрозніць свежую рыбу ад нясвежай? У свежай жабры шчыльна прыціснуты да цела і маюць цёмна-чырвоны колер, луска добра трымаецца, вочы не западаюць і не чырванеюць.

**Марына ШЫПУЛЬКА**

■ А вы ведалі?

# НА ЯМЫ — У ЗІМОВЫ «ІНТЭРНАТ»

**Як зімуюць рыбы? Розныя віды неаднолькава перажываюць гэты перыяд. Многія, такія як лешч, карп, лінь і іншыя, з паніжэннем тэмпературы вады ўжо ў кастрычніку-лістападзе збіраюцца ў касякі і адпраўляюцца на так званыя зімавальныя ямы — паглыбленні дна на рэках і азёрах. Тут яны праводзяць каля трох месяцаў практычна без руху.**

Звычайна ў ямах збіраюцца рыбы аднаго віду і ўзросту, што забяспечвае найлепшыя ўмовы для зімоўкі. Працэсы абмену ў арганізме рыб пры гэтым менш інтэнсіўныя, чым пры зімоўцы ў адзіночку, рацыянальна выкарыстоўваецца слізь, якая выдзяляецца рыбай у якасці ізаляцыйнага рэчыва. У гэты перыяд амаль усе рыбы перастаюць спажываць ежу, іх актыўнасць зніжаецца. Працэсы росту і абмену рэчываў прыпыняюцца, рэакцыя на знешнія раздражняльнікі таксама падае.

Рыба, якая залягае на зімавальных ямах, практычна безабаронная, таму неабходна строга выконваць патрабаванні па яе ахове. Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства прамысловая лоўля ўсіх відаў рыбы на зімавальных ямах забаронена з 1 кастрычніка па 15 красавіка. Пералік зімавальных ям з вызначэннем іх межаў указваецца ў біёлага-эканамічных і (або) рыбаводна-біялагічных абгрунтаваннях.

Выяўленнем і аховай зімавальных ям у фондзе запасу рыбалоўных угоддзяў займаюцца мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы або спецыяльна ўпаўнаважаныя імі юрыдычныя асобы за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў.

У зімовы перыяд таксама змяняюцца і паводзіны драпежнікаў пад вадой. Напрыклад, сом, калі лёд скоўвае ваду рэк, азёр і вадасховішчаў, хаваецца ў паглыбленыя месцы, прыціскаецца да мяккага глею і засынае, час ад часу варушачы сваімі плаўнікамі і доўгімі вусамі. Залягаюць самы ў ямы, як правіла, вялікімі групамі. На іх часам кладзецца іншая рыба, нярэдка ў некалькі ярусаў.

Для захавання папуляцыі звычайнага сома, які становіцца лёгкай здабычай у зімовы перыяд, па ўсёй краіне ўстаноўлена забарона на яго вылаў з 1 лістапада па 31 сакавіка. Забарона датычыцца не толькі прамысловай, але і аматарскай лоўлі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

■ У свеце раслін

# Пра што маўчаць іголкі?

## ЯКІЯ ПРАДСТАЎНІКІ ФЛОРЫ ЗАСТАЮЦЦА ЗАЎЖДЫ ЗЯЛЁНЫМІ?

**Восень — маляўнічая пара, калі дрэвы апранаюцца ў яркія строі, і, пакрасаваўшыся, скідваюць іх. Але не ўсе расліны прызвычаіліся мяняць колер лісця і тым больш пазбаўляцца яго. Пра вечназялёных прадстаўнікоў свету беларускай флоры распавядае старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі флоры і сістэматыкі раслін Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В.Ф. Купрэвіча НАН Беларусі Аркадзь СКУРАТОВІЧ.**

— Спачатку трэба разабрацца, чаму ўвосень дрэвы скідваюць лісце, — адзначае навуковец. — Па-першае, ліст — гэта орган, з дапамогай якога расліна дыхае. На яго паверхні знаходзіцца шмат невялікіх адтулін — вусціц, праз якія выходзяць дзясяткі літраў вадкасці. Да таго ж, апалае лісце — асноўная крыніца харчавання дрэва, яна дае пажыўныя рэчывы, якія па жылках і сасудах трапляюць у клубні і карані. Такім чынам расліна назапашвае «харч» на вясну. Яна пазбаўляецца ад лістоты, каб не выдаткоўваць вільгаць, якой у халодны перыяд становіцца вельмі мала. Інакш вусціцы працягвалі б рабіць сваю працу і выпарылі б з дрэва ўсе неабходныя рэчывы. У выніку яно загінула б ад засухі.

Другое класічнае пытанне: чаму восенню лісце мяняе колер?

— Давайце ўявім сабе ліст. У яго афарбоўцы ўдзельнічаюць некалькі элементаў. Хларафілу, адказнага за зялёны колер, прыкладна 70%. Астатнія рэчывы даюць жоўтае і аранжавае адценні. Зразумела, калі ўсе іх змяшаць, ліст усё роўна застанецца зялёным. Аднак увосень сонечнага святла становіцца менш, хларафіл разбураецца, і ў гульню ўступаюць іншыя рэчывы. Чырвоным альбо барвовым ліст становіцца дзякуючы антацыянам. Навукоўцы дакладна не ведаюць загадку гэтых рэчываў, вядома, што яны з'яўляюцца ў лісці толькі на пачатку вясны альбо ўвосень, — раскрывае «сакрэт» вучоны.

Аднак ёсць расліны, якія не мяняюць афарбоўку лісця і пакідаюць яго сабе. Усім вядомы хвойныя дрэвы: елка, сасна, піхта, ціс. У чым розніца паміж лістападнымі і вечназялёнымі дрэвамі?

— Плошча паверхні іголачкі нашмат меншая за плошчу ліста, — адказвае Аркадзь Мікалаевіч. — Адпаведна, на іголачках вусціц у разы менш, а значыць, яны выпараюць мала вільгаці. Акрамя гэтага, іголкі пакрыты зверху васковым налётам, што дадаткова забяспечвае ахову ад маразоў. Таму ў дрэва няма неабходнасці іх скідваць.

Тым не менш, нават вечназялёныя дрэвы ўсё ж скідваюць іголкі. Гэта адбываецца на другі, трэці альбо чацвёрты год. Іголкі — у пэўным сэнсе лакмусавая паперка для наваколля. Калі яны застаюцца на дрэве чатыры гады, значыць, умовы тут добрыя. А калі сасна скідвае іх на другі ці на трэці год — гэта знак, што экалогія не надта спрыяльная.



Фота Анатоля ДРЫБАСА.

Вечназялёныя дрэвы абараняюцца ад холаду з дапамогай іголак.

Аднымі хвойнымі дрэвамі група вечназялёных раслін не абмяжоўваецца. Сярод іх даволі шмат кустарнікаў і кустарнічкаў — гэта балотныя віды: мучанік, мядзведжыя ягады, балотны мірт. У многіх вечназялёных кустарнічкаў лісце пакрыта воскападобным налётам, які абараняе расліну ад холаду. А ў багуну маецца іншае «прыстасаванне» — вузкія лісточкі пакрыты апушэннем, нібыта шубай. У верасу лісточкі дробныя і маюць форму іголачкі, што дазваляе расліне не выпускаць шмат вільгаці. На зіму травы хаваюцца пад снег. Яны распаўзаюцца, але ўвысь не растуць, каб не быць вышэйшымі за ўзровень снегу. Такім чынам вечназялёныя расліны перажываюць зіму.

**Кацярына РАДЗЮК.**
*radziuk@zviazda.by*

## Друкуецца ў «Роднай прыродзе»

# АМЕРЫКАНСКІ ПІТБУЛЬТЭР'ЕР: СЯБАР ЦІ ЗАБОЙЦА?

**Калі называюць гэтую пароду сабак, адразу ўзнікае асацыяцыя з самай агрэсіўнай, злоснай і крыважэрнай жывёлай. Гэта таму што пітбуляў (так скарочана іх яшчэ называюць) задзейнічалі ў сабачых баях. Але ж жывёлы не вінаватыя, што людзі во працягу многіх гадоў мэтанакіравана развівалі і фарміравалі ў іх варожасць і злосць. Насамрэч пітбуль мае мяккі і ласкавы характар. Аднак, каб атрымаць аддананага, таварыскага і жыццярадаснага сябра, неабходна абавязкова прайсці курс дрэсіроўкі. Памылкі ў выхаванні гэтага моцнага і рашучага сабакі могуць каштаваць дорага...**

Амерыканскі пітбультэр'ер (слова «піт» з англійскай мовы — яма для бою) вядзе сваё паходжанне ад баявых бульдогаў Старога Свету, якія трапілі ў Амерыку разам з англійскімі і ірландскімі перасяленцамі ў канцы XVIII — пачатку XIX стагоддзя. У стварэнні пароды амерыканскага пітбультэр'ера самы непасрэдны ўдзел прымалі бульдогі і тэр'еры. У выніку ад бульдогаў пітбулі атрымалі непарасягнутую ўпартасць і вялікую сілу, а ад тэр'ераў — вокамгненную рэакцыю.

Прадстаўнікі гэтай пароды карысталіся шырокай папулярнасцю ў ЗША. Галоўным чынам іх трымалі для ўдзелу ў сабачых баях, для палявання і выратавальных пошукаў. Пасля забароны сабачых баёў у ЗША над прадстаўнікамі пароды быў усталяваны жорсткі кантроль. Варта адзначыць, што амерыканскі пітбультэр'ер не прызнаны Міжнароднай кіналагічнай федэрацыяй (FCI). У многіх дзяржавах Еўропы парода альбо забароненая, альбо дапускаецца яе абмежаванае ўтрыманне пры захаванні дастаткова строгіх правілаў.



### Агрэсію ў сабаку выхоўвае... гаспадар

Кінолагі падкрэсліваюць, што амерыканскі пітбультэр'ер не падыходзіць пачаткоўцам, неспрактыкаваным уладальнікам. Аднак пры правільным гадаванні, выхаванні і навучанні — гэта выдатны рабочы сабака. У дзіцячым узросце вельмі важна засцерагаць шчаня ад траўмуючых яго псіхіку фактараў. У дарослых, правільна выхаваных і навучаных сабак характары, як правіла, стабільныя. Яны ўпэўнены ў сваіх сілах, не імкнуцца дамінаваць над гаспадарамі, заўсёды гатовыя да выканання розных камандаў.

Пітбулі — жыццярадасныя і вясёлыя сабакі, гуллівасць і дзіцячая непасрэднасць выдатна спалучаюцца ў іх з мудрасцю і ўважлівасцю. Натуральна, усе гэтыя станоўчыя якасці могуць раскрыцца ў дарослым сабаку толькі пры ўмове правільнага догляду, выхавання і навучання.

Гэтыя сабакі здольныя авалодаць выкананнем разнастайных камандаў і асвоіць многія навыкі дзякуючы сваёй прыроднай жвавасці і дапытлівасці. Аднак, каб прывучыць сабаку да безумоўнага паслушэнства, спецыялісты аднагалосна раяць уладальнікам прайсці агульны курс дрэсіроўкі.

Не рэкамендуецца надаваць занадта вялікую ўвагу развіццю агрэсіўнасці пітбуля супраць чалавека, у выніку вы можаце атрымаць сабаку, небяспечнага для навакольных. Мала таго, што «амерыканец» валодае вельмі моцным укусам, пры атацы ён не проста кусае, а выбірае найбольш небяспечныя месцы.

Значна лепш для вас і навакольных выкарыстоўваць задаткі гэтага сабакі на іншай ніве — напрыклад, падрыхтаваць і паўдзельнічаць у спаборніцтвах па аджыліці (пераадоленне паласы перашкод на час), вейт-пулінгу (буксіроўцы цяжараў), спрынгполе (вісенні на канаце), дог-пулінгу (перацягванні каната). Такія спартыўныя мерапрыемствы пойдуць толькі на карысць папулярызацыі пароды.

### Парады ўладальнікам

Бліскучая кароткая поўсць, упэўнены позірк, спартыўны склад цела — вось прыкметы сапраўднага амерыканскага пітбультэр'ера.

Вышыня ў карку ад 46 да 56 см, вага ад 16 да 45 кг. Сабакі далёка не дробныя, таму ад уладальніка патрабуецца фізічная сіла для кіравання сваім гадаванцам. Сярэдняя працягласць жыцця — 12 гадоў. Пітбулі вылучаюцца выдатным здароўем і не дастаўляюць у гэтым плане практычна ніякіх клопатаў уладальнікам.

Сабакі выдатна пераносяць кватэрнае ўтрыманне, непераборлівыя, але патрабуюць дбайнай сацыялізацыі ў дачыненні да навакольнага свету. Ім неабходны цвёрды кантроль. Патрэбны працяглыя прагулкі з дастатковымі фізічнымі нагрузкамі і зносінамі з іншымі сабакамі. Дабратворна ўплывае на сабаку кампанія ўладальніка; доўгая адзінота можа нашкодзіць яго псіхіцы.

Поўсць патрабуе мінімальнага догляду — перыядычнага вычэсвання (хаця б адзін раз на тыдзень). Не забывайце таксама час ад часу чысціць вушы свайму гадаванцу, праціраць вочы і даглядаць зубы.

**Андрэй ШКЛЯЕЎ, інструктар-кінолаг**

### Цікавыя факты

- Самую вялікую ў гісторыі партыю кантрабандных наркотыкаў выявілі з дапамогай службовага пітбультэр'ера Попсікла. Сабака вызначыў месца захоўвання амаль паўтары тоны наркотыкаў.
- Пітбультэр'ераў часта выкарыстоўваюць у якасці падтрымальнай тэрапіі для цяжкахворых і пажылых людзей, а таксама для тых, хто атрымаў сур'ёзную эмацыйную траўму: яны жывуць пры шпіталях і дамах састарэлых. Пры спецыяльнай дрэсіроўцы гэтыя сабакі могуць абслугоўваць інвалідаў-калясачнікаў.
- Сабака быў настолькі папулярны ў пачатку XX стагоддзя, што стаў талісманам ЗША ў Першай і Другой сусветных войнах. Выява пітбуля неаднаразова з'яўлялася на рэкрутынгавых плакатах таго часу.

## Незнаёмцы з Чырвонай кнігі

# КЛОПАТЫ БЕЛАРУСКАЙ ТАРЦІЛЫ

**У часы Сярэднявечча еўрапейская балотная чарапаха была распаўсюджаным ласункам у Заходняй Еўропе. Лічылася, што яе мяса поснае. Сёння балотная тарціла стала чырвонакніжніцай і патрабуе аховы і дапамогі з боку чалавека.**



Фота Максіма ШАСТАКОВА

Адзіны на Беларусі від чарапах тыповы для большай часткі Еўропы. На беларускім Палессі праходзіць паўночная мяжа яго арэала, які раней быў значна шырэйшы і даходзіў да Віцебшчыны. Да сярэдзіны мінулага стагоддзя балотная чарапаха была звычайным відам на Беларусі. Сёння сустрэчу з тарцілай можна лічыць вялікай удачай: па словах навукоўцаў, чарапахі насяляюць толькі 4,2% вадаёмаў краіны. Чашам у адным месцы заўважаюць па 8, а то і 15 асобін! Зазвычай гэта натуральныя вадаёмы, якія чалавек не паспеў трансфармаваць. Дарэчы, агульная колькасць балотных чарапах у Беларусі не ўстаноўлена. Жывуць яны ў сярэднім па 15-17 гадоў, жыццёвы максімум, вядомы спецыялістам, складае 27 гадоў.

Балотная чарапаха харчуецца толькі дробнымі воднымі жывёламі: малюскамі, плывунцамі, стракозамі, хіранамідамі. За дзень рэптылія мусіць з'есці прыкладна 100-150 бесхрыбетных. У чарапахі добра развіты нюх: сваю здабычу нярэдка знаходзіць менавіта па паху, нават у тоўстым слоі доннага глею. Зіму праводзіць у здранцвенні, на дне вадаёмаў, якія на некалькі месяцаў пакрываюцца льдом.

Існуе меркаванне, што чарапашы панцыр даволі моцны і можа вытрымаць вялікія нагрузкі. Аднак падчас міграцый да месцаў размнажэння самкі выходзяць на дарогі і нярэдка гінуць. Дарэчы, у пошуках добрага месца для падвядзення патомства чарапахі могуць праходзіць да 3-4 кіламетраў за дзень. Для такой справы яны выбіраюць асветленыя сонцам схілы адкрытых пясчаных узгоркаў. Цікава, што ў балотных тарціл, як і ў іншых відаў чарапах, існуе тэмпературнае вызначэнне полу патомства. Пры тэмпературы вышэй за 30 °С з'яўляюцца толькі самкі, калі яна меншая за 27 °С — толькі самцы. У прамежкавых значэннях вылупяцца чарапахі абодвух палоў.

Вялікую шкоду чарапахам наносяць драпежнікі, якія разбураюць кладкі, з'ядаюць яйкі і маладняк. За год толькі лісы знішчаюць да 40% усіх кладак. Сваю лепту ўносіць і чалавек, які мяняе прыродныя экасістэмы. Таму для захавання рэптылій у Беларусі патрабуецца стварэнне спецыяльных рэзерватаў.

**Кацярына РАДЗЮК**

Чытайце ў кастрычніцкім нумары часопіса **«РОДНАЯ ПРЫРОДА»:**




— Чым займаюцца «касмічныя біёлагі»?

— Балота: кліматычны сябра ці вораг?

— Як карáлі пчаладзёраў у часы Вялікага Княства Літоўскага?

— Птушкі «на прыцэле», альбо Першы вопыт фотабёрдара.

— Дыета для ката-натурaеда.

## У свеце жывёл

# ЧАМУ МАТЫЛІ ЎПАДАБАЛІ ГАРЫШЧЫ,

## альбо Як зімуюць лускакрылыя

**Са школьных гадоў мы ведаем: матылькі — гэта насякомыя з поўным пераўтварэннем. Яйка трансфармуецца ў вусеня, затым у кукалку, і нарэшце становіцца дарослым матыльком — імага. Цікава, што розныя віды «лятаючых кветак» зімуюць на адной з пералічаных стадый (зімоўка доўжыцца прыкладна паўгода). Пра асаблівасці гэтага няпростага перыяду ў жыцці насякомых распавёў навуковы супрацоўнік лабараторыі наземных бесхрыбетных жывёл Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук па біярэсурсах Анатоль КУЛАК.**

Звычайна матылі «кладуцца спаць» у канцы восені — кастрычніку-лістападзе. Дарослыя асобіны ўпадаюць у здранцвенне. Падчас «забыцця» матылі расходуюць мінімум энергіі, усе працэсы жыццядзейнасці ў іх моцна запавольваюцца, таму патрэба ў харчаванні адпадае сама па сабе. Звычайна халады яны перажываюць пад снегам. Напрыклад, лімонніца западае пад апалае лісце, а ў сакавіку выбіраецца са свайго схованку.



Фота Анатоля КУЛАКА

Дзённае паўлінава вока зімуе на стадыі імага і адно з першых прачынаецца пасля спячкі.

— Некаторыя віды матылькоў могуць зімаваць побач з чалавекам, — адзначае Анатоль Кулак. — З іх ліку прадстаўнікі сямейства німфалід, зубчатакрылая соўка, некаторыя молі. Матылі аблюбавалі для зімоўкі гарышчы і падвалы, склепы. Іх здранцвеласцю карыстаюцца павукі і мышы, якія харчуюцца нерухомымі насякомымі. Таму не здзіўляйцеся, калі вясною ў падвале заўважыце рэшткі крыльцаў. Зрэдчас крапіўніца альбо дзённае паўлінава вока прабіраюцца ў кватэры. Аднак у чалавечым жытле яны гінуць, бо перасыхаюць ад недахопу вільгаці ў паветры.

Большасць відаў матылькоў зімуюць у выглядзе вусеня і кукалкі. Знешне гэтыя формы зазвычай маюць непрыкметную афарбоўку, што дазваляе ім хавацца ад птушак. Для спячкі выбіраюць зацішныя мясціны, хаваюцца ў расколінах пад карой дрэў, у траве альбо лісці. Падчас моцнай адлігі вусені здольныя перасоўвацца на невялікія адлегласці. У такой форме зімуе большасць відаў самага вялікага сямейства — совак, або начніц. Вусені мядзведзіцы перад спячкай плятуць сабе кокан: у камфортным сховішчы яны адчуваюць сябе абароненымі ад непагадзі і галодных драпежнікаў. На стадыі кукалкі зімуюць шкодныя прадстаўнікі бялянак: капусны бялян, бялянка бручкавая і рэпавая.

Яйка лічыцца самай уразлівай і крохкай формай матыля. Нямногія віды прыстасаваліся да зімоўкі ў такім «рызыкоўным» выглядзе. У асноўным гэта асеннія начныя віды — напрыклад, пядзенікі зімні і чубаты. Выгада ад падобнай зімоўкі таксама ёсць: позняй восенню на матылькоў не палююць кажаны і птушкі, якія ўжо адлецелі ў вырай. А ўвесну маладыя вусені пачнуць харчавацца спажыўнымі маладымі лісцікамі, з-за чаго наносяць вялікую шкоду лясным культурам. На стадыі яйка зімуе матыль-чырвонакніжнік мнемазіна, альбо чорны апалон. Прачынаюцца матылі ў асноўным падчас цвіцення нектараносных раслін, то бок у канцы красавіка—пачатку мая.

Анатоль Кулак адзначае, што частцы відаў цяжка адаптавацца да кліматычных змен і тэарэтычна яны могуць знікаць, як, напрыклад, жыхары верхавых балот перламутраўкі фрэя і фрыга. Тым не менш апошнім часам навукоўцы сталі часцей знаходзіць цеплалюбівыя віды матылёў.

Цікава, што ў далёкім мінулым, як мяркуюць навукоўцы, матылькі не ўпадалі ў спячку. Яны маглі перажываць усе стадыі пераўтварэння па некалькі разоў за год. Дарэчы, частка нашых відаў сёння так сябе і паводзіць, праўда, толькі ў цёплы час. З надыходам халадоў альбо, наадварот, гарачага і засушлівага сезона, калі немагчыма харчавацца ці актыўна рухацца, у працэсе эвалюцыі лускакрылыя пачалі адаптавацца да новых умоў. Для нашых шырот найбольш спрыяльнай лічыцца зімоўка матылёў у стадыі вусеня і кукалкі.

**Кацярына РАДЗЮК**

# МІГРАЦЫЙНАЯ ЛІХАМАНКА

## Еўропа не можа справіцца з небывалым наплывам бежанцаў

**У мінулую нядзелю па ініцыятыве кіраўніка Еўрапейскай камісіі Жан-Клода Юнкера прайшоў надзвычайны саміт. У Бруселі сабраліся лідары дзесяці еўрапейскіх краін (Аўстрыі, Балгарыі, Венгрыі, Германіі, Грэцыі, Македоніі, Сербіі, Славеніі, Румыніі і Харватыі), каб абмеркаваць шляхі выйсця з міграцыйнага крызісу. Які, дарэчы, шэраг экспертаў апраўдана лічаць найбуйнейшым з часоў Другой сусветнай вайны. Напярэдадні старшыня Еўрапейскага савета Дональд Туск назваў навядзенне парадку ў міграцыйнай сферы ЕС умовай захавання палітычнай стабільнасці ў Старым Свеце. Колькасць бежанцаў перакрывае ўсе магчымыя прагнозы і, нягледзячы на набліжэнне халадоў, працягвае павялічвацца.**



### СУР'ЁЗНЫ ТЭСТ

Лідары Еўрасаюза дамовіліся стварыць дадаткова 100 тысяч месцаў у цэнтрах па прыёме бежанцаў. Як гаворыцца ў выніковай заяве экстраннага саміту ЕС па міграцыйным крызісе на Балканах, сродкі для гэтага абяцаюць даць Еўрапейскі інвестыцыйны банк, Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця і Банк развіцця Савета Еўропы, паведаміла агенцтва BBC.

Толькі ў Грэцыю на мінулым тыдні прыбывалі па 9 тысяч мігрантаў за дзень. У адпаведнасці з новым дагаворам да канца года там павінны дадаткова адкрыцца цэнтры, здольныя змясціць да 30 тысяч чалавек. Яшчэ 20 тысяч месцаў абавязаўся забяспечыць Камітэт Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў. ААН таксама будзе адказваць за стварэнне цэнтраў на 50 тыс. чалавек у Балканскіх краінах, якія сталі галоўным пунктам прызначэння для мігрантаў, што імкнуцца трапіць у Германію і Скандынавію.

Падчас саміту ў Бруселі кіраўнікі 10 еўрапейскіх краін разам са сваімі калегамі з Албаніі, Сербіі і Македоніі пастанавілі таксама цягам тыдня накіраваць 400 паліцэйскіх у Славенію для забеспячэння кантролю міграцыйных плыняў і аховы межаў. Вырашана спыніць практыку перапраўкі мігрантаў да межаў суседніх краін «без папярэдняга апавяшчэння гэтых дзяржаў», а таксама прызначыць адказных, якія перадавалі б інфармацыю пра колькасць людзей, што перамяшчаюцца.

Як паабяцала канцлер Германіі Ангела Меркель, краіны ЕС будуць штодня абменьвацца інфармацыяй па міграцыйнай праблеме. Усяго ў плане, узгодненым усімі бакамі, пералічана 17 захадаў па барацьбе з крызісам. «Гэта адзін з самых сур'ёзных тэстаў, якія калі-небудзь праходзіла Еўропа», — адзначыла Ангела Меркель.

### ЯК ДАМОВІЦЦА?

Чаму ў нядзелю ў Брусель быў скліканы экстранны саміт ЕС? Справа ў тым, што на Балканах цяпер насамрэч склалася патавая сітуацыя. Невялікія краіны Еўропы, што апынуліся на шляху міграцыйных патокаў праз Балканы, забілі трывогу і сцвярджаюць: іх рэсурсы па прыёме бежанцаў практычна вычарпаны. Становішча пагаршаецца тым, што Венгрыя закрыла мяжу з Сербіяй і Харватыяй, што прымусіла мігрантаў шукаць альтэрнатыўныя шляхі на поўнач Еўропы.

Калі «ўзважыць» цяперашні грэчаскі трафік мігрантаў, то можна ўявіць парадак лічбаў колькасці бежанцаў па выніках года. Паводле апошніх звестак прымежнага агенцтва Еўрасаюза «Франтэкс», за першыя дзевяць месяцаў 2015-га на тэрыторыю еўрапейскіх краін прыбылі больш за 710 тысяч мігрантаў. І гэта зусім не мяжа, халады тут не перашкода. У Міжнароднай арганізацыі па міграцыі лічаць, што паток бежанцаў не спыніцца нават зімой, праўда, пры ўмове, што зіма будзе не вельмі халоднай. У верасні толькі ў Грэцыі затрымана больш як 140 тысяч нелегалаў, захоплена 189 суднаў, арыштавана каля 100 перавозчыкаў людзей.

Напрыканцы верасня лідары краін ЕС збіраліся на экстранны саміт у Бруселі, каб абмеркаваць крызіс, выкліканы рэзкім прытокам мігрантаў у многія еўрапейскія краіны. Напярэдадні кіраўнікі міністэрстваў унутраных спраў краін Еўрасаюза большасцю галасоў прынялі план увядзення квот на размяшчэнне 160 тысяч бежанцаў ва ўсіх 28 дзяржавах ЕС. Па плане старшыні Еўракамісіі Жан-Клода Юнкера, квоты будуць вызначаны ў залежнасці ад памеру эканомікі, колькасці насельніцтва і шэрагу іншых параметраў. Пры такім механізме больш за ўсё мігрантаў прымуць Германія (40 тыс.) і Францыя (32 тыс.). Польшчу абавяжуць размясціць у сябе 12 тыс. мігрантаў, краіны Балтыі — па 2—2,5 тыс. Найменшыя квоты дастануцца Кіпру і Мальце.

Аднак дамовіцца пра размеркаванне бежанцаў не ўдалося. Венгрыя, Славакія, Румынія і Чэхія катэгарычна выступілі супраць квот. Прэм'ер-міністр Славакіі Роберт Фіца заявіў, што яго краіна не можа пагадзіцца з сістэмай квот у цэлым. Ён назваў гэтую сістэму ірацыянальнай і пазбаўленай сэнсу. Раней Славакія заяўляла пра гатоўнасць прыняць толькі бежанцаў-хрысціян, і то ўсяго некалькі сотняў. Між тым сітуацыя на ўсходзе Еўропы абвастраецца. Венгерскія ўлады заяўляюць, што практычна завяршылі ўзвядзенне сцяны на мяжы з Харватыяй, аднак не плануюць адгароджвацца ад Славеніі. Пасля таго, як Венгрыя закрыла мяжу з Сербіяй, многія з мігрантаў, якія прыехалі ў Сербію, накіраваліся ў Харватыю, што рэзка абвастрыла стасункі паміж Белградам і Заграбам. Харватыя ўвяла рэжым узмоцненага памежнага кантролю.

Балканскія краіны заявілі пра гатоўнасць закрыць свае межы, каб не ператварацца ў буферную зону для мігрантаў, якія прыбываюць на тэрыторыю Еўрасаюза. Як паведаміў прэм'ер-міністр Балгарыі Бойка Барысаў па выніках перамоў са сваімі калегамі з Сербіі і Румыніі, краіны гатовы пайсці на такі крок, калі падобныя захады для прыпынення патоку бежанцаў прымуць Германія і Аўстрыя. «Калі Германія і Аўстрыя закрыюць свае межы, мы не дазволім нашым краінам стаць буфернай зонай для мігрантаў. Мы будзем гатовы закрыць межы», — заявіў Бойка Барысаў.

### ДРЭННАЯ ДЭМАГРАФІЯ

Палітыкі многіх усходнееўрапейскіх дзяржаў мяркуюць, што нерацыянальна адпраўляць бежанцаў у тыя краіны, у якія яны трапіць не імкнуцца. Сапраўды, Венгрыю ці Харватыю самі бежанцы ўспрымаюць толькі як транзітныя краіны на шляху ў багацейшыя Германію, Нідэрланды ці Швецыю з іх шчодрымі сацыяльнымі выплатамі і больш высокім узроўнем жыцця.

Імкненне Германіі праводзіць палітыку адчыненых дзвярэй у дачыненні бежанцаў многія тлумачаць дэмаграфічнымі праблемамі краіны. Насельніцтва скарачаецца з-за нізкай нараджальнасці: цягам 2008—2013 гадоў тут была зарэгістравана самая нізкая нараджальнасць у свеце. Пры захаванні цяперашніх тэндэнцый насельніцтва Германіі да 2060-га скароціцца з цяперашніх 82 млн да 70 млн чалавек. За той жа час насельніцтва Брытаніі вырасце да 77 млн, а Францыі — да 72 млн чалавек.

З пачаткам міграцыйнага крызісу Ангела Меркель заявіла, што Германія можа прыняць сёлета больш за 800 тысяч бежанцаў, галоўным чынам з Сірыі і іншых блізкаўсходніх краін. Такая лічба выглядае аптымістычна нізкай на фоне апошніх звестак пра колькасць мігрантаў. Улады Германіі ўжо абвясцілі пра выдзяленне дадатковых 4 мільярдаў еўра ўрадам федэральных земляў для размяшчэння мігрантаў і задавальнення іх першасных патрэб.

«Ці здолее Германія выкарыстаць бежанцаў для паляпшэння паказчыкаў свайго рынку працы? Пытанне спрэчнае. З аднаго боку, мяркуючы па шматлікіх паведамленнях у прэсе, значная частка бежанцаў з Сірыі прадстаўляе сірыйскі сярэдні клас з высокім узроўнем адукацыі, добрым патэнцыялам для адаптацыі і інтэграцыі ў новай краіне. З іншага боку, ёсць рызыка, што значная частка бежанцаў задаволіцца жыццём на сацыяльных дапамогі. І стане толькі клопатам для дзяржбюджэту», — прыводзіць expert.ru думку навукоўца супрацоўніка Інстытута даследаванняў міграцыі Берлінскага ўніверсітэта Гумбальта Клеменса Олерта.

### У ДЭФІЦЫЦЕ

Зрэшты, ёсць сэнс прыцягваць мігрантаў не толькі ў Германію з яе дэмаграфічнымі праблемамі і моцнай эканомікай, але і ў негатыўна настроеныя да мігрантаў усходнееўрапейскія краіны. Даследаванне кампаніі ManpowerGroup сведчыць аб тым, што 40% кампаній у Польшчы не могуць запоўніць адкрытыя вакансіі. У Венгрыі сітуацыя яшчэ горшая: вакансіі не запаўняюцца ў 56% кампаній. У Чэхіі і Славакіі такіх кампаній менш (18 і 28% адпаведна), але іх доля павялічваецца.

Найбольш вострая сітуацыя ў сектары інфармацыйных тэхналогій: найлепшыя супрацоўнікі з'язджаюць у багацейшыя краіны на поўначы і захадзе Еўропы ці ў ЗША. Польшча хоць і ператварылася ў паспяховы бэк-офіс еўрапейскага бізнесу дзякуючы IT-аўтсорсінгу, але дэфіцыт спецыялістаў летась усё ж складаў 50 тыс. чалавек. У Славакіі, дзе ў IT-галіне занята ўсяго 50 тыс. чалавек, у гэтым сектары застаецца незапоўненымі 10 тыс. працоўных месцаў. У Венгрыі адной з самых дэфіцытных прафесій сталі інжынеры — ад інжынераў-электрыкаў да будаўнікоў і праектантаў.

Як і ў Германіі, у краінах Усходняй Еўропы насельніцтва старэе і скарачаецца. Ужо да 2035 года насельніцтва Венгрыі скароціцца на 8% (а гэта больш за 800 тыс. чалавек), у Польшчы — на 6%. Тэндэнцыя міграцыі моладзі ў багацейшыя краіны ЕС, якая вызначылася на пачатку XXI стагоддзя, падобна, захаваецца на дзесяцігоддзі. Гэта азначае, што на прасторы ад Заграба і Будапешта да Варшавы і Рыгі дэфіцыт працоўных рук будзе толькі расці. Іншая справа, за кошт чаго ён будзе задавольвацца.

### СПЫНІЦЬ СІЛАЙ?

У Старым Свеце нарастае рост антыміграцкіх настрояў. «Яны павялічваюцца адпаведна з павелічэннем долі мігрантаў у грамадстве. Напрыканцы 1980-х гадоў канцлер Германіі Гельмут Шміт сказаў, што калі ў еўрапейскім грамадстве доля мігрантаў будзе набліжацца да 10 працэнтаў, то здарыцца сацыяльны выбух. Тая ж Германія пераступіла гэтую парогавую адзнаку, — заўважае вядучы навуковы супрацоўнік Цэнтра германскіх даследаванняў Інстытута Еўропы РАН Аляксандр Кашкін. — Што б там ні казалі, але едуць у Еўропу не толькі бежанцы, якія жадаюць знайсці новую радзіму, але і тыя, хто павяваў у шэрагах «Ісламскай дзяржавы» ды іншых груповак, і тыя, хто займаецца незаконнай дзейнасцю».

Абвастраецца крымінальная абстаноўка, узнікае напружанне ў грамадстве, таму месцічы пачынаюць усё горш ставіцца да бежанцаў. Нядаўняе апытанне паказала, што больш як 50% грамадзян Германіі асцерагаюцца наплыву мігрантаў. Нямецкія палітыкі таксама пераглядаюць сваё стаўленне да бежанцаў. Напрыклад, змяняецца фармат дапамог у бок «дэманетызацыі» — з грашовых выплат на харчовыя талоны.

Большасць экспертаў сходзяцца ў думцы, што ў найбліжэйшай перспектыве паток бежанцаў у Стары Свет будзе толькі павялічвацца. Відавочна, для таго, каб справіцца з «міграцыйнай ліхаманкай», неабходны больш рашучыя захады. «Бяспечная і багатая Еўропа апынулася ў коле войнаў, ад якіх будуць бегчы людзі, каб выратаваць сваё жыццё. Іх можа спыніць ці завяршэнне гэтых войнаў, ці стварэнне такой сітуацыі, калі ўцёкі будуць дакладна гэтак жа пагражаць смерцю, — напісала польская Gazeta Wyborcza. — Іншымі словамі, Еўропе трэба або ўмяшацца ў канфлікты, якія ствараюць міграцыю, або спыніць гэтую міграцыю сілай».

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.** litvinov@zviazda.by



■ След на зямлі

# «Я РАТУЮ ЯЕ, А ЯНА — МЯНЕ»

## Былы старшыня калгаса, Герой Сацыялістычнай Працы адзін узнаўляе колішнюю панскую сядзібу

**Генрых Міхайлавіч адчыняе веснічкі і запрашае зайсці. І тут жа са смехам згадвае: «Калі ў 2012 годзе мне прадалі гэты дом, умоўна кажучы, за базавую велічыню, адзін карэспандэнт напісаў, што гады праз тры тут будзе двухметровая агароджа і аўчарка пры весніцах. Бачыце, няма ні плота ў рост чалавека, ні сабак злых, кожны можа зайсці сюды».**

### АПОШНЯЕ ЛЕТА АЖЭШКІ

Генрых Траццяк у Флер'янове чалавек не чужы. Ён нарадзіўся і вырас у гэтых мясцінах. А ў 1969 годзе вярнуўся сюды пасля заканчэння Беларускай сельгасакадэміі дыпламаваным аграномам. ВНУ, дарэчы, скончыў з адзнакай, выпускніка запрашалі застацца ў аспірантуры. Але ён вырашыў, што тэорыя без практыкі нежывая, таму папрасіўся ў калгас.

Кандыдацкую дысертацыю Генрых абароніць потым, намнога пазней. А пакуль заняў пасаду агранома ў гаспадарцы, якая мела ўраджайнасць — 9 цэнтнераў з гектара. Праз год там сабралі ўжо 18 цэнтнераў, а яго на агульным сходзе калгаснікаў абралі старшынёй. 28 гадоў Генрых Міхайлавіч кіраваў калгасам. І гаспадарка яго была адной з найлепшых не толькі ў рэспубліцы, але ва ўсёй вялікай краіне. Згадзіцеся, у 1987 годзе яшчэ мала хто мог пахваліцца ўраджайнасцю ў 62 цэнтнеры. А ў калгасе імя Ламаносава атрымлівалі роўна столькі. Таму ўзнагароджанне старшыні ордэнам Леніна і Зоркай Героя Сацыялістычнай Працы стала лагічнай адзнакай поспехаў яго прадпрыемства. Варта заўважыць, што ў гарбачоўскую эпоху «зоркі» давалі значна радзей, чым раней. Таму прысваенне высокага звання Генрыху Траццяку ў 1988 годзе можна лічыць сведчаннем асабліва вялікіх поспехаў калгаса імя Ламаносава. Адным словам, гаспадарка грымела амаль на ўвесь СССР. А праўленне калгаса знаходзілася ў былой панскай сядзібе, на гісторыю якой тады асаблівай увагі ніхто не звяртаў.

У 1990-я гады ўсё пачало хутка мяняцца. І як толькі споўнілася 60 гадоў, Генрых Траццяк пайшоў на пенсію. Новы кіраўнік палічыў былое памяшканне праўлення занадта старамодным і перанёс офіс сваёй гаспадаркі ў суседні двухпавярховы будынак. А былы фальварак Бохвіцаў, як усялякае пакінутае жытло, пачаў пакрысе прыходзіць у заняпад. Яшчэ шчасце, што дом самога Траццяка знаходзіцца зусім побач з названай сядзібай. І ўсе гэтыя гады Генрых Міхайлавіч проста прыглядваў за будынкам, інакш яго разрабавалі б і разнеслі, як здаралася з нічыйнымі пабудовамі. А так дом паволі пацíху разбураўся.

Герой Сацыялістычнай Працы тым часам не сядзеў склаўшы рукі на пенсіі, актыўна займаўся грамадскай работай: і ў сваёй вёсцы, і ў раёне. Але думка пра тое, як захаваць жыццё старой сядзібы Бохвіцаў, заўсёды прысутнічала, можа, нават на ўзроўні падсвядомасці. Генрых Міхайлавіч зацікавіўся гісторыяй «флер'яноўскага кута» і адкрыў для сябе столькі цікавага! Яшчэ на пачатку XX стагоддзя фальварак атрымаў вядомасць дзякуючы творам і лістам Элізы Ажэшкі. Яна гасцявала і папраўляла сваё здароўе ў Флер'янове і так пасябравала з яго гаспадарамі, што прысвяціла ім сваю лірычную кнігу «Збор лістоў» ды шмат іншых невялікіх твораў, у тым ліку эпісталярнага жанру. Ёсць версія і пра рамантычнае каханне славутай пісьменніцы да гаспадара сядзібы Тадэвуша Бохвіца. Праведзенае Ажэшкай лета ў гэтым фальварку стала апошнім у яе жыцці. Але застаўся дуб, пасаджаны пісьменніцай у 1909 годзе побач з домам, пра гэта нагадвае мемарыяльная таблічка, якая ўстаноўлена даволі даўно...

Потым чаго толькі ні пабачыла старадаўняя сядзіба. У Першую сусветную немцы вывезлі каваную браму, якая была ўпрыгажэннем фальварка. У Другую сусветную, падчас акупацыі, паводле ўспамінаў старых людзей, тут дыслацыравалася нямецкая жаночая дыверсійная школа. Пазней размяшчалася кантора МТС (машынна-трактарнай станцыі), апошнім гаспадаром, як ужо гаварылася, быў калгас.

Двухпавярховы драўляны дом узведзены Бохвіцамі недзе ў 1870—1875 гадах. Пасля да яго далучылі парадную прыбудову з чырвонай цэглы, якая, на першы погляд, стварае рэзкі кантраст. Але вельмі хутка да яе прывыкаеш, яна нечым нагадвае паменшаную копію замкавых сцен з вежамі і выглядае даволі прыгожа. Асабліва здалёк. А зблізку відаць, што дзе-нідзе сцяна адрамантавана.

### НАДЗЕЙНАЯ ПАДТРЫМКА І АПОРА

Калі пачалі шмат гаварыць пра рэстаўрацыю гістарычных аб'ектаў, ды і нямала рабіць на гэтым шляху, Генрых Траццяк зацікавіўся перспектывай куплі гэтага аб'екта за адну базавую велічыню. І звярнуўся з адпаведнай заявай да сходу сельгаспрадпрыемства, таму што будынак быў на балансе СВК. Жонцы ж Ларысе Паўлаўне пакуль вырашыў не казаць. Не ведаў, як яна ўспрыме. Яны выгадавалі траіх сыноў. Цяпер старэйшыя ўнукі — студэнты. Бацькі іх жывуць на зарплату, свайго бізнесу не маюць. І, як большасць дзядуляў з бабулямі ў нашай краіне, Траццякі ім дапамагаюць. Узяцца ж за такі аб'ект — гэта пастаянна выдаткоўваць грошы. Думаў, што называецца, і днём, і ноччу, а жонцы да часу пра планы не гаварыў. Калі ж сход прыняў рашэнне, гэта значыць, яго былыя калгаснікі прагаласавалі, каб старую сядзібу аддаць, прыйшоў дадому і з парога аб'явіў. Па дарозе абдумваў розныя варыянты, чакаў яе слоў, як прысуду... А яна паглядзела з разуменнем і вымавіла нешта накшталт:

— Ну, вядома, правільна зрабіў, я ва ўсім цябе падтрымаю.

І гэта была радасць у яго жыцці, не меншая, а можа, і больш значная, чым ранейшыя ўзнагароды. Потым разважыў: хіба магло ў іх з Ларысай быць інакш? Некалі яе, карэнную ленінградку, прывёз у вёску. Не адмовілася жыць тут, не настойвала на аспірантуры і перспектыве застацца хаця б у Горках. Шмат гадоў таму раздзяліла з ім усе цяжкасці старшынства. На пачатку іх жыцця ў вёсцы маці малых дзяцей хадзіла за сем кіламетраў на працу, бо бліжэй школы не было, і не патрабавала для сябе службовую машыну. Так што, як усвядоміў яшчэ раз без малога 80-гадовы чалавек, Ларыса Паўлаўна — яго самая надзейная апора. І гэта таксама надае сілы ў сённяшніх клопатах.

А іх вельмі многа. Дакументы былі зроблены ў 2012 годзе, заплачана славутая адна базавая і яшчэ 500 долараў у эквіваленце за афармленне папер. З таго часу былая сядзіба Бохвіцаў стала прыватнай уласнасцю Генрыха Траццяка. Па дамоўленасці з жонкай ён траціць палову пенсіі кожны месяц на будаўнічыя матэрыялы і аплату працы наёмнага рабочага. Цяпер гэта прыкладна тры мільёны рублёў. Але названых сум, вядома, не хапае. Даводзіцца нешта «пазычаць» з уласных зберажэнняў, вышукваць іншыя магчымасці. З фізічнай часткай работы дапамагаюць сябры, родныя, блізкія.



Генрых ТРАЦЦЯК.




Таблічка ля дуба Элізы Ажэшкі.

### ПЕНСІЯ, ПАМНОЖАНАЯ НА ЭНТУЗІЯЗМ

За гэты час паступова ўдалося прыбраць кустоўе і бур'ян, уставіць вокны, дзе іх не было, паправіць дах, замазаць дзіркі ў столі, памяняць гнілыя дошкі ў падлозе, зрабіць шмат іншага. Пасля ачысткі запрацаваў камін, якому больш за сто гадоў. Цяпер там весела патрэскваюць дровы, і пакой даволі хутка награваецца. Прыведзена ў парадак яшчэ адна печка, якая добра абагравае памяшканне.

Сцены ў пярэдніх залах ачышчаны і атынкаваны, зараз не выглядаюць запушчанымі.

— Мы гэта зрабілі прымітыўным спосабам, — паказвае Генрых Міхайлавіч, — падраўнялі сцены самі, як змаглі. Калі рабіць сапраўдны рамонт, трэба наймаць спецыялістаў, пакуль на гэта сродкаў няма. А так чыста, з даху не цячэ, можна людзям зайсці. Вось з мяне і даволі.

Людзі сюды заходзяць. Трапляюцца выпадковыя экскурсанты, потым яны паведамляюць сваім сябрам, знаёмым, яшчэ заязджаюць наведвальнікі. Для іх ужо завялі кнігу водгукаў. А летам у былой сядзібе Бохвіцаў прайшло раённае свята «З крыніц спрадвечных». Тут сабралася з дзясятак фальклорных калектываў, паказвалі сваё мастацтва. Былі і рамеснікі, народныя майстры. А яшчэ летам у былы панскі дом прыходзяць вясковыя дзеці. Ларыса Паўлаўна арганізавала нешта накшталт гуртка паэзіі і музыкі. Школьнікі, у тым ліку тыя, што гасцююць у бабуль на канікулах, бяруць з сабой музычныя інструменты, іншыя могуць спяваць альбо дэкламаваць вершы. І дзеці ўжо палюбілі гэтыя вячоркі ля каміна. Меншыя атрымліваюць салодкія прызы, большыя — магчымасць выступіць на публіцы. І ў гэтым угадваецца пэўная пераемнасць традыцый. Эліза Ажэшка пакінула ўспаміны, як пасля абеду штодзень на верандзе ладзіліся чытанні і літаратурныя дыскусіі.

— Некаторыя мне гавораць: «Чаму табе не сядзіцца на пенсіі з вудай на беразе альбо з кніжкай на канапе? Каб адрадзіць гэтую сядзібу пасапраўднаму, патрэбны многія сотні тысяч долараў. А што твая пенсія, памножаная на энтузіязм?» — цытуе знаёмых Генрых Міхайлавіч. — А я ім адказваю, што не стаўлю задачу адрадзіць сядзібу ў першапачатковым выглядзе. Я стаўлю задачу: не даць загінуць. Пакуль і гэтага хопіць. Я ратую яе, а яна — мяне.

Генрых Траццяк расказвае, як тры гады таму баяўся падняцца па драбінцах, каб сарваць яблыкі з дрэва. Спіна балела, ногі трымцелі. А цяпер сам на страсе чарапіцу папраўляе. «Нібы другое дыханне адкрылася. Відавочна, што мы вельмі мала ведаем як пра свой арганізм, так і пра пабудову сусвету наогул», — заключае 80-гадовы чалавек.

Цяпер ён будуе планы, як закончыць касметычны рамонт у астатніх пакоях, правесці ваду. Пакоі новы гаспадар хоча зрабіць прыдатнымі для жыцця. Раней жа тут быў пансіянат, дзе людзі адпачывалі, набіраліся сіл. У будучыні, лічыць ён, можна разглядаць такую магчымасць.

— Як вядома, найлепшы адпачынак — гэта перамена дзейнасці. Яшчэ разумныя людзі кажуць, што, калі ты лёг на канапу, ты пачаў паміраць. Жывы чалавек, пакуль рухаецца, пакуль робіць нешта патрэбнае. Вось пасадзіла Эліза Ажэшка дуб, яе самой ужо сто гадоў няма, а дрэва расце. Мы ўсе яе ўспамінаем, таблічку прымацавалі. А я вырашыў у гонар 100-годдзя таго дуба пасадзіць дуброву са ста дубкоў. Мяне падтрымалі ў і савеце ветэранаў, і моладзь, і райвыканкам.

Генрых Міхайлавіч вядзе мяне на месца былога саду. А тут ужо ўзняліся і шумяць роўна сто дубкоў. Іх добра відаць адсюль, ад старога ажэшкаўскага дуба. Маладыя дрэвы, нібы дзеці яго, велізарнага, нагадваюць, што ўсё ў свеце ўзаемазвязана і добрыя справы не знікаюць, а маюць працяг.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

**Фота аўтара і з архіва Г. Траццяка.**
*Ляхавіцкі раён*

■ Ад прашчураў...

# НЕ ТОЛЬКІ ПАГЛЯДЗЕЦЬ, АЛЕ І ПАТРЫМАЦЬ У РУКАХ

## можна будзе гістарычную пячатку старадаўняга манастыра

Прэзентацыя сярэдневяковай каменнай пячаткі-матрыцы, якая была знойдзена ў ліпені 2015 года пры археалагічных раскопках на тэрыторыі старога манастырскага паселішча, адбудзецца ў двары Свята-Елісееўскага Лаўрышаўскага мужчынскага манастыра, які размешчаны на правым беразе ракі Нёман, насупраць вёскі Гнесічы Навагрудскага раёна.

«Звязда» паведамляла пра гэтую падзею. Арганізатары, нягледзячы на асаблівую каштоўнасць знаходкі, абяцаюць гасцям даць магчымасць патрымаць пячатку ў руках і ўважліва разгледзець яе.

Знойдзеная пячатка стала адным з гучных археалагічных адкрыццяў гэтага года. Яна выраблена са сланцавага каменю, па форме нагадвае брусок, на адной з граняў якога выразаны двухрадковы надпіс. Гэта адна з найбольш ранніх пячатак, адносіцца да часоў ВКЛ (XIII—XIV стст.). Асабліва цікавая яна для даследчыкаў тым, што гэта матрыца, а не адбітак (што знаходзяць часцей).

Раскопкі на тэрыторыі паселішча Лаўрышаўскага манастыра праводзіла маладзёжная валанцёрская экспедыцыя пад навуковым кіраўніцтвам доктара гістарычных навук, прафесара гісторыі Сяргея Рассадзіна. Паводле адной з версій, надпіс на пячатцы сумяшчае старажытнагрэчаскую і старажытнарускую мовы і чытаецца як «Святая пустэльня». Археалагічныя даследаванні вяліся пры падтрымцы манастыра.

Раней паведамлялася, што пячатка-матрыца будзе выстаўлена не толькі ў манастыры, але і ў Навагрудку, а таксама ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

***Лаўрышаўскі манастыр — адзін з найстарэйшых у Беларусі, заснаваны каля 1260 года святым прападобным ігуменам Елісеем і манахам Лаўрэнціем, які да манаства быў вядомы як Войшалк Міндоўгавіч, вялікі князь ВКЛ (1264—1267). У XIII-XIV стагоддзях манастыр быў летапісным цэнтрам, у 1329 годзе тут было напісана Лаўрышаўскае Евангелле, рукапісны помнік беларускай кніжнай справы.***

# НЕЎМІРУЧЫ ДУХ АГІНСКАГА

## Ён адзіны ў гісторыі музыка-аматар, творы якога былі папулярнымі ва ўсёй Еўропе яшчэ пры яго жыцці



Помнік Агінскаму ля Маладзечанскага музычнага каледжа.

**Спадчына Міхала Клеафаса АГІНСКАГА аб'яднала прадстаўнікоў пяці краін. Яны сабраліся разам у Маладзечне — на роднай зямлі вялікага кампазітара, каб разам адсвяткаваць 250-годдзе з дня яго нараджэння. Беларусы, літоўцы, рускія, украінцы, палякі прадстаўлялі свае даследаванні на міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, якая называлася «Культурная спадчына роду Агінскіх і яе значэнне для сучаснага развіцця грамадства». Асоба славутага папярэдніка, ушанаваная належным чынам, раскрылася па-новаму, аб'яднала брацкія народы праз творчую спадчыну.**

Аказалася, не ўсё яшчэ даследавана і вывучана не толькі ў біяграфіі, але і ў тым, што стварыў Агінскі. **Прафесар, музыказнаўца Віктар СКАРАБАГАТАЎ** падказаў, на што могуць накіраваць сваю ўвагу даследчыкі:

— Я вельмі параіў бы шукаць скрыпічныя творы. Бо ў свой час Агінскі быў выдатным скрыпачом, а фартэпіяна для яго займала толькі другое месца. Аднак чамусьці захаваліся менавіта фартэпіянныя творы. Вельмі раю зацікаўленым людзям звярнуцца да рукапісных фондаў бібліятэкі Маскоўскай кансерваторыі імя Чайкоўскага. Я бачыў там (але, на жаль, не захаваў ксеракопій) яго творы для скрыпкі, фартэпіяна і голасу. Сцверджанне, што не ўсё яшчэ знойдзена з творчай спадчыны Агінскага, — абсалютна слушнае. Святлане Немагай удалося адшукаць твор яго сына (магчыма, напісаны разам з бацькам) — гэта варыяцыя на тэму трэцяй арыі Моцарта. У нас яшчэ шмат працы па пошуку напісанага Агінскім, і, я ўпэўнены, наперадзе надзвычай цікавыя адкрыцці.

Прафесар распавёў таксама, што створана партытура апошняга балета кампазітара. Літаральна праз тыдзень яна пабачыць свет у выдавецтве «Каўчэг».

Як заўсёды, грунтоўна і надзвычай займальна пра Агінскага распавядала **вядомая даследчыца яго спадчыны Святлана НЕМАГАЙ**. Яна звярнулася да феномена асобы гэтага чалавека, які адначасова быў і кампазітарам, і палітычным дзеячам:

— Асноўнай дзейнасцю Агінскага была дыпламатыя, ён займаў розныя дзяржаўныя пасады. Аднак тагачаснае грамадства ўспрымала яго ўсё-такі скрозь прызму створанай ім музыкі, як аўтара маршаў, паланэзаў, што прадвызначылі твар эпохі. Менавіта яго музычная аўра з'яўляецца тым магнітам, які прыцягвае ўвагу нават сучасных людзей. Феномен папулярнасці асобы, 250-гадовы юбілей якой мы сёлета адзначаем так шырока, хаваецца найперш у папулярнасці яго музыкі. У XVIII—XIX стагоддзях музыкантамі найчасцей былі людзі не самага высокага саслоўя. Таму нельга сцвярджаць, што Агінскаму, які займаўся палітычнай дзейнасцю, была выгадная менавіта такая вядомасць. Аднак усё-такі ведалі і шанавалі Агінскага найперш як кампазітара.

Міхал Клеафас Агінскі быў адзіным у гісторыі музыкам-аматарам, творы якога карысталіся вялікай папулярнасцю ва ўсёй Еўропе яшчэ пры яго жыцці. Трымаюць пазіцыю ўсеагульнай любові яны і сёння.

Сваё месца творчасць кампазітара заняла і ў сэрцы **рускага даследчыка — члена апякунскай рады фонду «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага» Юльяна БЕЛЬСКАГА**. Падчас свайго выступлення на канферэнцыі ў Маладзечне ён прамовіў па-беларуску:

— Гэта Агінскі прывёў мяне да вашай краіны і мовы. Сем гадоў таму я ўпершыню прыехаў у Залессе, пазнаёміўся з Рыгорам Сарокам. Тады са мною здарыліся сапраўдныя прыгоды, і я насамрэч адкрыў для сябе беларускую зямлю. Сёння я, прадстаўнік Масквы, сучасны рускі патрыёт, прызнаюся ў любові Беларусі. Бо «як не любіць гэту рэчку і бор, і зялёны садок, і крыклівую гусь. А што часам тут страшна заенча віхор. Гэта енк, гэта крык, што жыве Беларусь».



Рыгор САРОКА і Адам МАЛЬДЗІС разважаюць пра творчую спадчыну кампазітара.

Бельскі прачытаў верш, напісаны пра Агінскага расійскім паэтам Ігарам Жданавым. Адчувалася, што для нашых усходніх суседзяў асоба беларускага кампазітара таксама надзвычай важная і блізкая.

**Загадчыца аддзела гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, доктар гістарычных навук з Літвы Рамуне ШМІГЕЛЬСКІТЭ-СТУКЕНЕ** распавяла, што ў фондзе Агінскіх у літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве захоўваюцца дакументы, з якіх можна даведацца пра асабістыя стасункі і фінансавыя справы кампазітара. Гэта 95 лістоў карэспандэнцыі, якую ён пісаў да сваёй эміграцыі і пасля яе. Маецца вялікая перапіска з дачкой Амеліяй (98 аркушаў). Захавалася некалькі лістоў ад першай жонкі і вялікая колькасць — ад другой. Можна прачытаць ліставанне з братамі і дзядзькам, ад якога ў спадчыну Агінскі атрымаў землі на Маладзечаншчыне і ў Залессі. Зрэшты, літоўская даследчыца ўжо падрабязна вывучыла гэтыя дакументы і склала досыць яскравы партрэт пра «закуліснае жыццё» кампазітара, на долю якога выпала два банкроцтвы і дзве жонкі...

У канферэнцыі таксама ўдзельнічаў **доктар філалагічных навук, прафесар Адам МАЛЬДЗІС**. З уласцівай яму дасведчанасцю і арыгінальнасцю ён прапанаваў заснаваць новую прэмію імя Агінскага, якой узнагародзяць найлепшых даследчыкаў спадчыны кампазітара. Жартоўна трыма бaгінямі агінсказнаўства Мальдзіс назваў дырэктара выдавецтва «Чатыры чвэрці» Ліліяну Анцух, якая сёлета выдала мемуары Агінскага ў перакладзе на рускую мову, таксама навуковую супрацоўніцу музея ў Залессі Таццяну Кляшчонак, якая выпусціла тры брашуры, прысвечаныя яго асобе, і, вядома ж, Святлану Немагай, якая колькі часу таму напісала ўласную кніжку пра Агінскага, змясціўшы ў ёй сенсацыйныя даследчыцкія адкрыцці.

Вяршыняй увекавечвання памяці кампазітара, верагодна, стала опера, пастаўленая ў Маладзечанскім музычным каледжы імя Агінскага. Музыку для яе стварыў Алег Залётнеў, лібрэта напісаў Сяргей Макарэй. Аднак сама ідэя і яе рэалізацыя належыць **дырэктару каледжа Рыгору САРОКУ**, які адзначыў:



Узнагароды ад фонду «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага».

— Без перабольшвання, гэтай операй я паставіў Агінскаму другі помнік на беларускай зямлі (першы, манументальны, стаіць побач з музычным вучылішчам). Опера выклікала вялікія эмоцыі ў слухача, у прафесійных беларускіх музыкаў. Гэта важна як для ўсёй краіны, так і для нас, бо Агінскі насіў тытул «граф Маладзечанскі». Аднак на дасягнутым мы не будзем спыняцца. Цяпер адабралі сем паланэзаў Агінскага, для якіх я ствараю партытуры разам з выпускніцай Верай Рыбінскай. У хуткім часе яны з'явяцца ў выдавецтве «Чатыры чвэрці». Такім чынам, музыку Агінскага зможа выканаць вялікі сімфанічны аркестр.

Юбілейны год вялікага кампазітара працягваецца. Яшчэ пару месяцаў мы можам ушаноўваць, адкрываць для сябе гэтую ўнікальную асобу. Каб памяць пра яе стала нязгаснай. Нездарма на Маладзечаншчыне колькі гадоў таму ўтварыўся мясцовы дабрачынны фонд «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага», які выступіў адным з арганізатараў святкавання і на будучыню мае шмат цікавых праектаў... Развітваючыся з Радзімай, напісаўшы пра яе свой знакаміты паланэз, кампазітар быццам пакінуў запавет нам, нашчадкам: берагчы і захоўваць любоў у сваім сэрцы. Гэта актыўна робяць сёння не толькі маладзечанцы, але і ўсе беларусы. І прадстаўнікі суседніх краін таксама далучаюцца.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*
**Фота аўтара.**
*Маладзечанскі раён.*

■ Радзімазнаўства



# ПАД КРЫЛАМІ «МАЦІ-РАДЗІЦЕЛЬНІЦЫ»



Пляценне з залацістай жытнёвай саломкі прыцягвае пяцікласніцу Вікторыю САПОНЕНКУ.

## авалодваюць ведамі вучні мінскай гімназіі №41 імя В.Х. Сярэбранага. Музей этнакультуры стаў тут своеасаблівым і адказным звяном у справе выхавання і адукацыі

Варта толькі пераступіць парог гэтага музея, зрабіць першыя крокі ўздоўж зашклёных вітрын — перад вачыма, нібы ў паскоранай кіназдымцы, з'яўляцца, паплывуць фрагменты нашай гісторыі. З даўніны далёкай у сённяшні час — звычайны для наведвальнікаў экскурсійны шлях. Незвычайнае тут іншае: побач з некаторымі музейнымі рэліквіямі — іх сённяшнія копіі, напрыклад тканыя, упрыгожаныя арнаментам ручнікі. Адзін з іх, нібы ўзмах крыла, выцягнуўся да столі, прыцягвае ўвагу пунсовым малюнкам — стылізаваным сілуэтам жанчыны .

— Гэты арнамент завецца «Маці-Радзіцельніца», вобраз існуе з часоў матрыярхату і ўвасабляе надзею на прадаўжэнне жыцця, — «расшыфроўвае» змест вышыванкі **настаўніца, член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Святлана БЕЛАШ**.



Настаўніца Святлана БЕЛАШ з вучнямі падчас майстар-класа.

«Маці-Радзіцельніца» — апякунка жанчын, якая дае надзею на прадаўжэнне, натхняе на творчы пошук, і гэта яскрава відаць у музеі, дзе можна ўзяць у рукі сатканыя згодна традыцыйным узорам беларускія паясы.

— Такія паясы вучні выткалі для імі ж створанай калекцыі па матывах гарадского касцюма жыхароў Беларусі XI—XIII стагоддзяў, — працягвае спадарыня Святлана. — Да таго ж пошук не абмежаваны пакоямі, дзе стаяць кросны ці мальберты. Гімназісты шмат разоў наладжвалі этнаграфічныя экспедыцыі ў маленькія вёскі, дзе ад дзядоў і бабуль пераймалі прыёмы традыцыйных народных рамёстваў, збіралі для свайго музея прадметы вясковага побыту. Памятаю, як у адной з вёсак гаспадыня сталага веку падвяла юных музейшчыкаў да пахіленага хлеўчыка і дазволіла забраць адтуль усё, што спадабаецца. Маўляў, усё адно ўнукі вырашылі на гэтым ламаччы шашлыкі гатаваць. Не адну рэдкую старажытную вясковую прыладу ўратавалі тады вучні. Добра, што гаспадыня пазычыла маленькі вазок — на яго пагрузілі будучыя экспанаты.

Рэдкіх экспанатаў у музеі шмат. Кожны з іх распавядае пра пэўны час, пра вынаходлівых майстроў-гаспадароў. Вось, напрыклад, выразаны з дрэва, па-сучаснаму кажучы, «трафарэт» — каб чарот клаўся на страху роўнымі радкамі. Вось прылада, якую падвязвалі пад серп, калі жалі грэчку: ніводнае зернейка са сцяблінкі не гублялася! Вось алюмініевы чыгунок, які пасля вайны вясковы ўмелец адліў з металічных рэштак збітага варожага самалёта. Ёсць тут і калекцыя пашытых хатнімі гаспадынямі вырабаў — яны ў пасляваенны час папаўнялі небагаты жаночы гардэроб. Зразумела, што няма неабходнасці пераймаць уменне майстраваць такія чыгункі, але ахвотных навучыцца працаваць за кроснамі — шмат. Такіх юных аматараў у музеі чакаюць зробленыя па старых узорах невялікія кросны: запрашаем на майстар-клас!

